

Каб святочная ноч удалася

СТАР. 5



Бразільскі вектар супрацоўніцтва

СТАР. 6



Навагоднія ўспаміны алімпійскіх чэмпіёнаў

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 СНЕЖНЯ 2015 г. СЕРАДА № 251 (28109) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЯКАСЦЬ І БЯСПЕКА

**У краіне створаны механізмы нагляду за адпаведнасцю прадукцыі, якая паступае на ўнутраны рынак, патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага і Еўразійскага эканамічнага саюзаў**

Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі выявіў парушэнні адпаведнасці тэхнічным рэгламентам у 72% праверанай прадукцыі, заявіў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.

Паводле яго слоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА, забаронена рэалізацыя прадукцыі на агульную суму амаль Br63 млрд, складзена каля 5 тысяч пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях, накладзена штрафаў на суму больш як Br16,5 млрд, выдадзена 58 прадпісанняў аб спыненні дзеяння на тэрыторыі краіны дакументаў аб пацвярджэнні адпаведнасці тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза і 66 прадпісанняў аб забароне ўвозу і абароту небяспечнай прадукцыі на тэрыторыі рэспублікі.

Андрэй Кабякоў канстатаваў, што 49% з выяўленых парушэнняў у імпартнай прадукцыі тычыліся неадпаведнасці ў галіне маркіроўкі інфармацыі для спажыўца, 25% — адсутнасці дакументаў, якія сведчаць якасць і бяспеку, 14% — неадпаведнасці заяўленым характарыстыкам тавараў, 12% — неадпаведнасці патрабаванням бяспекі. «У асноўным гэта тычыцца тавараў для дзяцей і падлеткаў, мэблевай прадукцыі, тавараў лёгкай прамысловасці, цацак», — сказаў ён.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, у краіне створаны механізмы нагляду за адпаведнасцю прадукцыі, якая паступае на ўнутраны рынак, патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага і Еўразійскага эканамічнага саюзаў. «Указам №48 у Беларусі створаны механізмы нагляду за адпаведнасцю прадукцыі, якая паступае на ўнутраны рынак, патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага і Еўразійскага эканамічнага саюзаў, сфарміравана сістэма адказных органаў дзяржаўнага нагляду за выкананнем такіх рэгламентаў у сферы спажывецкага рынку па адпаведных напрамках», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Так, Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі адказвае за выкананне патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў, Міністэрства аховы здароўя — санітарна-эпідэміялагічных і гігіенічных патрабаванняў і працэдур, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання — патрабаванняў у галіне ветэрынарыі, забеспячэнне якасці збожжа і камбікармоў, харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў, Міністэрства гандлю — у галіне абароны правоў спажыўцоў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях — у галіне пажарнай і прамысловай бяспекі.

Андрэй Кабякоў канстатаваў, што завяршаецца працэс прывядзення заканадаўства ў адпаведнасць з указам №48. Па выніках папярэдняга пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў, на якім разглядалася аналагічная тэма, зацверджаны і рэалізуецца план мерапрыемстваў на 2015-2016 гады па ўзаемадзеянні дзяржаўных органаў па выяўленні спажывецкіх тавараў, якія не адпавядаюць патрабаванням бяспекі і заяўленым характарыстыкам. «Такім чынам, можна канстатаваць, што неабходны інструментарый створаны», — падсумаваў прэм'ер-міністр.

# ЯНЫ ЎЖО ІДУЦЬ ДА ВАС




Фота БЕЛТА.

Парад навагодніх персанажаў у сталіцы.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:**
*«На пытанне, ці не пагражае мадэрнізацыя скарачэннямі, адказ — не. Паколькі захаваць працоўныя месцы можна за кошт пашырэння вытворчасці, асваення новых відаў прадукцыі. Праблема не ў колькасці працоўных месцаў, а ў тым, што высокатэхналагічныя аперацыі на вытворчасці патрабуюць высокакваліфікаваных, падрыхтаваных кадраў. Таму магчымасць мець стабільную і добрааплатную працу наўпрост залежыць ад імкнення работніка павышаць свой прафесійны ўзровень».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18555,00 | ▲ |
| Еўра | 20347,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 256,05 | ▼ |
| Укр. грыўня | 781,26 | ▲ |

■ Парламенцкі дзённік

## ПАДТРЫМАЦЬ БІЗНЕС

### могуць і мясцовыя ўлады, і замежныя інвестыцыі

**Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі на прыкладзе холдынга «Марка» шукаў спосабы эфектыўнага ўзаемадзеяння прадпрымальніцкага сектара і дзяржаўных органаў улады.**

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ звярнуўся да генеральнага дырэктара кіруючай кампаніі холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка», члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Мікалая Мартынава, з канкрэтнымі пытаннямі: «Вы падаткі плаціце, занятасць забяспечваеце, у тым ліку для тых, хто мае абмежаваныя магчымасці, але ці створаны органамі мясцовага кіравання і самакіравання належныя ўмовы для вашай працы? Ці няма ў іх рабоце цяганіны, абыякавасці? Бо гутарка ідзе пра камфортныя ўмовы не толькі для вас, а ўвогуле для прадпрымальнікаў».

— Што тычыцца мясцовай улады абласнога, гарадскога, раённага ўзроўняў, я лічу, што заканадаўча ёсць усе магчымасці для таго, каб вырашаць набалелыя пытанні, у тым ліку звязаныя з выкананнем Указа № 467 «Аб мерах па развіцці гарбарна-футравай вытворчасці і вытворчасці абутку». Увогуле ўзаемапаразуменне з мясцовымі ўладамі ў нас ёсць, — адказаў Мікалай МАРТЫНАЎ.

Аднак кіраўнік «Марка» зрабіў і некалькі прапаноў, якія, на яго думку, аблегчаць і палепшаць працу холдынга і любога іншага прадпрыемства, якое працуе ў Беларусі. Напрыклад, трэба дазволіць паўнавартасна выкарыстоўваць магчымасці цэнтралізаванага фонду кампаніі. «Ён створаны, але на заканадаўчым узроўні такому фонду трэба надаць юрыдычную сілу», — лічыць ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Рэха прыёмнай кампаніі

## ПАТРАБУЮЦЦА ЭКОЛАГІ, РАДЫЁЭЛЕКТРОНШЧЫКІ І ПАЛІГРАФІСТЫ

### На якія спецыяльнасці сёння прыцягнуць моладзь праблематычна?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У бягучым годзе патокі выпускнікоў школ размеркаваліся наступным чынам: 60,6 працэнта адзінаццацікласнікаў зрабілі свой выбар на карысць атрымання вышэйшай адукацыі (гэта на 8 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе). 20,6 працэнта паступілі ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 17,2 працэнта выпускнікоў пайшлі ў прафтэхустановы, каб атрымаць рабочую прафесію.**

**З выпускнікоў базавай школы выбар на карысць прафесійна-тэхнічнай адукацыі зрабілі 19,4 працэнта ад іх агульнай колькасці і 14 працэнтаў паступілі ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Астатнія вырашылі прадоўжыць навучанне ў школе.**

### МЭТАВАЯ ПАДРЫХТОЎКА — НЕ ДЛЯ ПРАФТЭХУСТАНОЎ?

План прыёму ва ўстановы прафтэхадукацыі за кошт сродкаў бюджэту быў выкананы ў бягучым годзе на 97,2 працэнта — недабор склаў 974 чалавекі.

Затое план па мэтавай падрыхтоўцы быў выкананы толькі на 77 працэнтаў.

СТАР. 2

■ Грошы

## МІНІМАЛЬНЫ ЗАРОБАК ВЫРАСЦЕ

**Згодна з пастановай Савета Міністраў №1094, са студзеня 2016 года мінімальная месячная заработная плата будзе складаць 2,3 мільёна. Гэта на 200 тысяч больш за цяперашні ўзровень. Яе памер быў праіндэксаваны з улікам інфляцыі.**

«Мінімалка» прымаецца ў якасці самай нізкай мяжы аплаты працы. Работніку, які заняты цэлы працоўны дзень і выконвае свае абавязкі, не маюць права налічваць менш. У Мінпрацы адзначаюць, што калектыўным дагаворам можа быць вызначаны іншы памер мінімальнага заробку, але ён не павінен быць ніжэйшым за ўзровень, устаноўлены ў адпаведнасці з законам.

Работніку, у якога налічаны заробак аказаўся меншым за мінімальны, наймальнік абавязаны даплаціць гэту розніцу. Пры вызначэнні памеру даплаты не ўлічваюцца кампенсацыйныя выплаты і выплаты да водпуску, свят, на аздараўленне, пры выхадзе на пенсію, нараджэнні дзіцяці і іншыя.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### За прыняцце закона аб дармаедстве выступаюць 45% расіян

Амаль палова насельніцтва Расіі (45%) — за неабходнасць прыняцця закона аб дармаедстве. Такія вынікі апытання Усерасійскага цэнтра вывучэння грамадскай думкі. Адзначаецца, што 45% апытаных вызначаюць дармаедства як адсутнасць працы без уважлівай прычыны, а таксама нежаданне працаваць. 21% рэспандэнтаў называюць дармаедамі ўсіх беспрацоўных, а 8% — усіх тых, хто жыве за чужы кошт. У красавіку СМІ паведамлялі, што дэпутаты пецярбургскага заканадаўчага сходу прапануюць караць папраўчымі або прымусовымі работамі тэрмінам да года расіян, якія ўхіляюцца ад працаўладкавання пры наяўнасці падыходзячай працы. УЦДГМ паведамляе, што за ўвядзенне закона ў асноўным выступаюць пенсіянеры (59%) і прыхільнікі КПРФ (53%).

### Кітай: адна сям'я — двое дзяцей



Пастаянны камітэт Усекітайскага Сходу Народных Прадстаўнікоў прагаласаваў за прыняцце перагледжанага закона аб народанасельніцтве і планавым дзетараджэнні, згодна з якім у Кітаі з 1 студзеня 2016 года будзе ажыццяўляцца палітыка «адна сям'я — двое дзяцей». ЦК Камуністычнай партыі Кітая ў кастрычніку 2015 на чарговым пленуме прыняў рашэнне ўкараніць правіла «дваіх дзяцей», якое распаўсюджваецца на ўсе сем'і. Яно павінна прыйсці на змену палітыцы, якая дзейнічала на працягу дзесяцігоддзяў: — «адна сям'я — адно дзіця». Упершыню палітыка абмежавання нараджальнасці была ўведзена ў Кітаі ў пачатку 1970-х гадоў з мэтай скарачэння колькасці насельніцтва. За гэты час у Кітаі ўдалося не дапусціць павелічэння колькасці насельніцтва прыкладна на 400 млн чалавек, аднак гэтую палітыку называюць прычынай узнікнення многіх сацыяльных праблем, такіх як скарачэнне колькасці працаздольных і старэнне насельніцтва.

### Магнітная бура абрынецца на Зямлю ў навагоднюю ноч



Навукоўцы зафіксавалі ўспышку на Сонцы, яна можа выклікаць магнітную буру ў ноч на 1 студзеня. Пра гэта заявілі расійскія вучоныя Інстытута зямнога магнетызму, іонасферы і распаўсюджвання радыёхваляў. Успышка працягласцю больш за тры гадзіны зафіксавана 28 снежня ў цэнтральнай частцы сонечнага дыска. Па звестках навукоўцаў, выпраменьванне ад успышкі даходзіць да нашай планеты за два-тры дні, адпаведна выкінуты паток часціц дасягне Зямлі якраз у навагоднюю ноч. Навукоўцы папярэджваюць, што ў гэты дзень некаторыя людзі могуць адчуваць лёгкае недамаганне. Адзначаецца, што амаль палова насельніцтва Зямлі адчувае на сабе ўплыў магнітных бур.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Шакалад уратуе ад дыябету

Як перадае Food Consumer, навукоўцы высветлілі: маладыя людзі з нармальнай вагой, якія рэгулярна спажываюць шакалад, абаронены ад дыябету.

У прынцыпе, працуе і шакалад, і какава. Раней ужо было ўстаноўлена, што гэтыя прадукты змагаюцца з інсулінавай рэзістэнтнасцю, акісляльным стрэсам, запаленнем. Так, спажыванне шакаладу зніжае рызыку дыябету на 17%. Прычым выгаду ад шакаладу ў большай ступені можна ацаніць, калі няма гісторыі сардэчна-сасудзістых хвароб. Усе плюсы ў меншай ступені праяўляюцца ў зусім дарослых людзей і асоб з лішняй вагой. Эксперты падкрэсліваюць: какава і прадукты з яе даўно трапілі ў пералік суперпрадуктаў. Яны дапамагаюць прадухіліць развіццё хвароб сэрца. Праўда, спецыялісты да гэтага часу не вызначыліся адносна карысці малочнага шакаладу. У ім шмат тлушчу і цукру.



■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## ПАДШЫЎКА ВАШАЙ ГАЗЕТЫ — ГІСТОРЫЯ, ЯКУЮ НЕЛЬГА АДКІНУЦЬ

**Анатоль БУТЭВІЧ, пісьменнік, намеснік старшыні Беларускага фонду культуры, член нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА:**



— Са «Звяздой» мяне звязваюць даўнія і шматлікія сувязі, якія пачаліся ў 60-я гады мінулага стагоддзя, калі я яшчэ вучыўся ў Сноўскай сярэдняй школе. Мае бацькі тады жылі ў вёсцы Баяры і выпісвалі і «Звязду», і раённую газету «Чырвоны сцяг», і іншыя — усяго ў дом у розныя гады прыходзіла да пяці выданняў.

У школе я хацеў быць журналістам, таму асмельваўся пісаць. Найперш, вядома, у раёнку, але накіроўваў лісты таксама і ў рэспубліканскія выданні. Як ні дзіўна, але найчасцей мяне друкавала менавіта «Звязда», што для школьніка было вельмі ганарова. Мяне нават пачалі называць селькарам! Гэта, а таксама тое, што ва ўсе гады «Звязда» была цікавай газетай, вельмі матывавала выпісваць яе. Мае бацькі, між іншым, засталіся вернымі выданню: нават калі я ўжо з'ехаў з дому ў Мінск і не друкаваўся на яе старонках, яны працягвалі выпісваць і «Звязду», і маладзёжную газету «Чырвоная змена».

Дарэчы, з «Чырвонкай» у мяне таксама самыя блізкія адносіны — з 1975 года я працаваў у ёй намеснікам рэдактара, таму і са «Звяздой» меў дзелавыя сувязі. Многія журналісты «Чырвонай змены» станавіліся супрацоўнікамі «Звязды», і гэта было ганарова і адказна. З тых часоў я памятаю многіх добрых рэдактараў, якія і самі пісалі, і газету цікавую рабілі, і «Чырвонцы» моцна дапамагалі. Гэта, напрыклад, Міхаіл Дзялец, Аркадзь Тоўсцік, Уладзімір Наркевіч... (Пэўна, праз такія цесныя сувязі «Чырвоная змена» і стала з цягам часу дадаткам да «Звязды».)

Калі бацькоўскі дом асірацеў, я забраў падшыўкі «Звязды» на дачу, дзе і захоўваю. Яны ўжо сталі гісторыяй, якую нельга адкінуць. «Звязда», відаць, нездарма ўзяла дэвіз: «Родная газета на роднай мове». Для мяне асабіста яна цікавая сваімі публікацыямі ў розных галінах: культуры, гісторыі нашай зямлі, аховы помнікаў. Апошняе, дарэчы, асабліва баліць мне. Хацелася б, каб і «Звязда», і іншыя выданні, звярталі на гэтую праблему яшчэ больш увагі.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І паўгоддзе 2016 года!

5 разоў на тыдзень!

СЁННЯ ВЫ ЯШЧЭ ПАСПЯВАЕЦЕ!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# У ПЕРШАЧАРГОВЫМ ПАРАДКУ

## будуць прадстаўляцца Прэзідэнту Праекты прававых актаў па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі

**Гэта прадугледжана ўказам № 523, які Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 28 снежня 2015 года, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Указ накіраваны на ўдасканаленне з улікам правапрымяняльнай практыкі парадку ўнясення на разгляд Прэзідэнта Беларусі праектаў прававых актаў. У адпаведнасці з указам прапановы аб прыняцці рашэнняў, што патрабуюць прававога рэгулявання, павінны ўносіцца ў выглядзе поўнасцю адпрацаваных і ўзгодненых з зацікаўленымі праектаў прававых актаў, а не пісем з ініцыятывамі.

Удакладнены правілы прадстаўлення на разгляд кіраўніка дзяржавы праектаў прававых актаў, падрыхтаваных аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. Такія праекты павінны прадстаўляцца на разгляд Прэзідэнта праз Савет Міністраў. Праекты прававых актаў па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны прадстаўляюцца Прэзідэнту ў першачарговым парадку. Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

■ Блізкая ўлада

# 2200 НОВЫХ РАБОЧЫХ МЕСЦАЎ СТВОРАЦЬ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

**Нягледзячы на няпростую сітуацыю ў эканоміцы і недабор запланаваных паступленняў у бюджэт, у вобласці выканалі першачарговыя задачы ў сацыяльнай сферы і ні на дзень не сарвалі выплату заробкаў бюджэтнікам. Пра гэта паведаміў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Задача на наступны год — стварыць на Гродзеншчыне 2200 новых рабочых месцаў. Прычым гэтую лічбу вызначылі не прыблізна, а дакладна пралічылі з улікам уводу ў эксплуатацыю новых аб'ектаў у розных сферах. Па шэрагу з іх зачын ужо зроблены. У прыватнасці, у Лідзе, дзе літоўская кампанія ARVI ўзводзіць комплекс па вытворчасці мяса індычкі. У сярэдзіне 2016-га плануецца атрымаць першую прадукцыю, якая будзе прадавацца не толькі ў Беларусі, але і на замежных рынках. Зразумела, ствараючы новыя рабочыя месцы і папаўняючы бюджэт падаткамі.

Акрамя таго, Уладзімір Краўцоў лічыць вельмі важнай лагістычную прывабнасць Гродзеншчыны. Кожныя суткі праз тэрыторыю вобласці праходзяць больш за 10 тысяч адзінак транспарту, і гэтымі транспартнымі калідорамі трэба ўмела карыстацца — з выгадай і для аўтамабільных перавозчыкаў, і для рэгіёна. З гэтай мэтай будуецца буйны транспартна-лагістычны цэнтр у пункце пропуску «Брузгі» на беларуска-польскай мяжы. Такія цэнтры з'явяцца таксама ў пунктах пропуску «Бераставіца» і «Каменны Лог». Гэта паспрыяе росту лагістычных паслуг і, разам з тым, працаўладкаванню нашых спецыялістаў.

Што ж тычыцца доўгачаканай рэканструкцыі аўтатрасы М6 Мінск — Гродна (на гэтыя мэты Сусветны банк выдзеліў крэдыт у памеры 250 мільёнаў долараў і, акрамя таго, плануецца ўдзел кітайскага капіталу), то цяпер у завяршальнай стадыі выбар падрадчыка, а ў красавіку 2016-га плануецца распачаць дарожнабудаўнічыя работы. На ўсім працягу гэта будзе траса першай катэгорыі з дзвюма палосамі руху ў кожным кірунку.

Уладзімір Краўцоў паведаміў, што ў наступным годзе ставіцца задача дыверсіфікаваць знешнеэканамічную дзейнасць. Пры ўсім значэнні для нас традыцыйнага рынку Расіі сёлетнія рэаліі паказалі, што неабходна больш актыўна працаваць не толькі там, але і на іншых замежных рынках — Еўропы, Азіі, Паўднёвай Амерыкі. Шэраг крокаў у гэтым кірунку сёлета зрабілі. У прыватнасці заключылі тры пагадненні з рэгіёнамі Казахстана, і ўжо ёсць канкрэтныя праекты. Напрыклад, ААТ «Лідсельмаш» плануе пастаўляць камбайны ў Джамбыльскую вобласць з перспектывай стварэння там сумеснай зборачнай вытворчасці. Шклозавод «Нёман» упершыню выйшаў са сваёй прадукцыяй на кітайскі рынак. Кітайцы зацікавіліся і дзіцячым харчаваннем, якое выпрабляе «Беллакт» — прадпрыемства ўжо прайшло адпаведную сертыфікацыю і пасля вырашэння з дапамогай беларускіх дыпламатаў некаторых арганізацыйных пытанняў распачне пастаўкі прадукцыі ў Кітай. Ёсць таксама добрыя напрацоўкі па экспарце тавару вытворцаў Гродзеншчыны ў Пакістан і іншыя краіны.

Паколькі не хапае бюджэтных інвестыцый у будаўніцтва, на парадак дня выходзіць і пытанне экспарту будаўнічых паслуг. Пэўны вопыт тут ужо ёсць: прадпрыемствы «Гроднапрамбуд» і «Гроднажылбуд» задзейнічаюць свой патэнцыял у тым ліку і за межамі нашай краіны, маюць там падрады на наступны год.

Яшчэ адной прыярытэтнай задачай на будучы год Уладзімір Краўцоў лічыць паляпшэнне турыстычнай прывабнасці беларускай часткі Аўгустоўскага канала. Шэраг пераўтварэнняў чакаецца ўжо да пачатку чарговага турыстычнага сезона. Па абодва бакі мяжы ёсць зацікаўленасць у тым, каб надаць новы статус пагранічнаму пункту пропуску «Лясная-Рудаўка». Калі раней ён быў толькі водным, то неўзабаве павінен паслужыць і пешаходам, веласіпедыстам. Яшчэ адным важным крокам у інтарэсах турыстаў і памежных рэгіёнаў магло б стаць стварэнне на Аўгустоўскім канале зоны для бязвізавага ўезду — накшталт той, што дзейнічае ў Белавежскай пушчы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# ВЫХАВАННЕ... ДАРОСЛЫХ

**Сёлетні прэзідэнцкі дэкрэт №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» стаў адным з заканадаўчых актаў, якія бурна абмяркоўваюцца. Як у «глыбінцы» прадстаўнікі ўлады ўпэўніваюць землякоў у неабходнасці працаваць, плаціць падаткі, кампенсаваць дзяржаве выдаткі на ўтрыманне дзяцей? Пра гэта карэспандэнту «Звязды» распавяла намеснік старшыні Лёзненскага райвыканкама Ірына ДЗЕРВАЕД.**



***— Днямі вы бралі ўдзел у пасяджэнні савета прафілактыкі Лёзненскага сельвыканкама. Яны праводзяцца з мэтай уздзеяння на тых, хто злоўжывае спіртным, не хоча працаваць, выхоўваць дзяцей і г.д. Наколькі эфектыўныя такія мерапрыемствы?***

— Гэта толькі частка грунтоўнай працы, якую праводзяць у сельвыканкамах і на раённым узроўні ўлады. Напрыклад, яшчэ дзейнічаюць назіральныя камісіі, каардынацыйны савет па выкананні дэкрэта Прэзідэнта №18, які накіраваны на абарону дзяцей, камісія па справах непаўналетніх... Звычайна на пасяджэнні, акрамя службовых асоб, запрашаем прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, святароў. Начальнік РАУС, прадстаўнік пракуратуры распавядаюць выкліканым пра іх «перспектыву» з пункту гледжання закону. А святар гаворыць пра Біблію, пра неабходнасць выконваць запаведзі... Сярод членаў камісіі ёсць і нарколаг, кіраўнік цэнтра занятасці. Апошні адразу ж можа прапанаваць працоўнае месца з улікам спецыяльнасці, якой чалавек валодае. Ёсць магчымасць бясплатна атрымаць новую спецыяльнасць.

***— Дарэчы, Ірына Апалінар'еўна, ці шмат у раёне беспрацоўных?***

— Сёння толькі 34 грамадзяніны зарэгістраваны ў якасці беспрацоўных, узровень беспрацоўя — 0,8%... Так, блізка Расія, і некаторыя працуюць там. І калі людзі за мяжой на працы афіцыйна, зразумела, прэтэнзій няма.

У нас ёсць і практыка ўладкавання на працу тых, хто вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі... Зразумела, што ў такой жыццёвай сітуацыі чалавеку вельмі складана. У першы час «Чырвоны Крыж» вылучае для такіх прадуктовыя наборы, адзенне. Здаралася, што адказныя асобы праводзілі акцыі па зборы адзення, прадуктаў. Мы, дарэчы, не толькі раней судзімых падтрымліваем. Калі ёсць праблема, грамадзяне могуць атрымаць аднаразовую і адрасную дапамогу...

***— Вы згадалі дэкрэт №18. Ён, акрамя іншага, абавязвае праблемных бацькоў кампенсаваць дзяржаве выдаткі на выхаванне дзяцей. Наколькі паспяхова ў Лёзненскім раёне праводзіцца праца ў гэтым кірунку?***

— Праца з абавязанымі асобамі — вялікі «пласт» дзейнасці ўлады. Іх у раёне 46 чалавек. Вядома, найперш нам трэба абараніць дзяцей у сем'ях. І ўжо другі напрамак нашай працы — пакрыццё выдаткаў абавязанымі. Сёння яно дасягнула ўзроўню 56%. Але ёсць праблема. У прыватнасці, калі абавязаныя жывуць у нашым раёне, мы можам кантраляваць працэс выплат. А калі пераехалі, узнікаюць цяжкасці. Безумоўна, калі працэнт пералічэнняў нізкі, мы звяртаемся ў цэнтр занятасці і гэтак далей. Але механізм гэты перыядычна не спрацоўвае да канца... Працуем над тым, каб і бацькоўства прызнавалі. Зразумела, калі і мама, і тата будуць разам кампенсаваць дзяржаўныя выдаткі, працэнт кампенсацыі абавязанымі павысіцца...

Пры гэтым, лічу, самае галоўнае — вярнуць дзяцей у біялагічныя сем'і. Пры магчымасці трэба зрабіць усё, каб захаваць, аднавіць сям'ю. І зноў жа прадстаўнікі ўлады павінны гэтым займацца... У нас, дарэчы, нядрэнныя вынікі. У раёне нізкі паказчык па пазбаўленні бацькоўскіх правоў. Сёлета, напрыклад, нікога не пазбавілі. Наадварот — бацькоў у чатырох сем'ях, дзе 7 дзяцей, аднавілі ў правах.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

# ДА КІЕВА ЗАРАЗ ЛЯТАЮЦЬ ЧАСЦЕЙ

**«Белавія» ўвяла чацвёрты штодзённы рэйс паміж Мінскам і Кіевам у Міжнародны аэрапорт Кіеў (Жуляны). Аб гэтым паведаміла начальнік аддзела рэкламы і камунікацый авіякампаніі Вольга Герасенка.**

«Да нядаўняга часу па гэтым напрамку самалёты «Белавія» лятаілі двойчы ў дзень у аэрапорт Барыспаль і адзін раз у Міжнародны аэрапорт Кіеў (Жуляны). Што тычыцца Нацыянальнага аэрапорта Мінск, то пасажыры, якія прыбываюць сюды, зараз могуць скарыстацца стыкоўкамі з іншымі рэйсамі «Белавія» для палётаў па большасці кірункаў нашай маршрутнай сеткі», — адзначыла начальнік аддзела.

Вылет з Мінска прызначаны на 13.30, з Кіева — у 14.20 па мясцовым часе. Палёт зойме адну гадзіну.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПАТРАБУЮЦЦА ЭКОЛАГІ, РАДЫЁЭЛЕКТРОНШЧЫКІ І ПАЛІГРАФІСТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Ва ўмовах адсутнасці конкурсу практычна па ўсіх спецыяльнасцях прафесійна-тэхнічнай адукацыі навучэнцы не імкнуцца заключаць дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы, а арганізацыі — заказчыкі кадраў — практычна не ўдзельнічаюць у рабоце па прыцягненні навучэнцаў да паступлення на ўмовах мэтай падрыхтоўкі і не прадугледжваюць для выпускнікоў-мэтавікоў дадатковыя сацыяльныя льготы і прэферэнцыі, — канстатуе **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.**

Найбольш запатрабаваныя на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў моладзі прафесіі цырульніка, кухара, кандытара, трактарыста-машыніста, кіроўцы аўтамабіля, электрагазазваршчыка, электраманцёра ахоўна-пажарнай сігналізацыі. Як і летась, былі істотныя праблемы з камплектаваннем груп па прафесіях лёгкай прамысловасці, машынабудавання, сельскагаспадарчай вытворчасці, дрэваапрацоўкі, будаўніцтва...

— Праца па павышэнні прэстыжнасці рабочых прафесій і прыцягненні ўвагі выпускнікоў да атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі павінна быць пастаяннай, — падкрэслівае Вадзім Богуш. — Відавочна, што толькі намаганняў устаноў адукацыі і органаў кіравання адукацыяй у гэтым напрамку будзе недастаткова. Трэба кардынальна змяніць ролю працадаўца: у рознай форме прыцягваць да гэтай работы арганізацыі — заказчыкаў кадраў, аб'яднанні наймальнікаў і прафсаюзы.

## ДАДАТКОВЫ НАБОР — БЕЗ ЗНІЖЭННЯ «ПАРОГА»

Недапрацоўваюць заказчыкі кадраў пры заключэнні дагавораў на мэтавую падрыхтоўку і з будучымі студэнтамі ВНУ. Так, на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы былі прыняты 2225 чалавек, што складае 85,4 працэнта ад плана. Цалкам выканалі паказчыкі прыёму на мэтавыя месцы толькі ВНУ Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства культуры і МНС.

Доля тэхнічных, тэхналагічных і будаўнічых спецыяльнасцей у агульным прыёме на дзённую бюджэтную форму навучання склала ў бягучым годзе 33 працэнты, медыцынскіх — 9,4 працэнта, сельскагаспадарчых — 10 працэнтаў, эканамічных і юрыдычных — амаль 14 працэнтаў, педагагічных — 9,6 працэнта.

— Заказ на падрыхтоўку юрыстаў, эканамістаў, кіраўнікоў працягвае зніжацца, затое хуткімі тэмпамі павялічваецца попыт наймальнікаў на спецыялістаў па экалогіі, радыёэлектроннай і вылічальнай тэхніцы, хімічнай і паліграфічнай прамысловасці, спорце, турызме. З іншага боку, выклікае трывогу змяншэнне прыёму па спецыяльнасцях транспарту, металургіі, лёгкай прамысловасці... Мяркуем, што зніжэнне паказчыкаў прыёму па гэтых напрамках звязана з нізкай запатрабаванасцю вострадэфіцытных спецыяльнасцей у абітурыентаў, што наўпрост звязана з недастатковай прафарыентацыйнай работай арганізацый — заказчыкаў кадраў, — кажа Вадзім Богуш.

Кантрольныя лічбы прыёму на бюджэт (на дзённую і завочную форму навучання) на 100 працэнтаў выканалі ВНУ Міністэрства культуры, Міністэрства аховы здароўя, МУС, Міністэрства абароны, Дзяржпагранкамітэт, Мінсувязі і МНС.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Па выніках залічэння ў рамках асноўнага набору на дзённую бюджэтную форму ў ВНУ вакантным засталося 391 месца, што склала 1,7 працэнта ад кантрольных лічбаў прыёму (у 2014 годзе — 1561 месца, або 6,8 працэнта ад кантрольных лічбаў прыёму). Незапоўненымі па выніках асноўнага набору заставаліся месцы ў 12 установах вышэйшай адукацыі.

У дадатковую хвалю «парогавыя» значэнні прахадных балаў па выніках ЦТ не зніжаліся, як гэта рабілася ў папярэдні год. Тым не менш, пасля правядзення дадатковага набору колькасць вакантных месцаў скарацілася да 147.

## РОСТ БАЛАЎ НА ЦТ ПАВЫСІЎ ПРАХАДНУЮ ПЛАНКУ

У 2015 годзе ВНУ канстатавалі прыход абітурыентаў з больш высокімі баламі ў сертыфікатах ЦТ і адпаведна рост прахадных балаў. Усяго на цэнтралізаваным тэсціраванні было зафіксавана 277 стабальных вынікаў: па рускай мове — 83, беларускай мове — 18, матэматыцы — 89, фізіцы — 7, хіміі — 21, грамадазнаўстве — 29, англійскай мове — 23, біялогіі — 5, гісторыі Беларусі — 2. А 11 абітурыентаў атрымалі 100 балаў па двух вучэбных прадметах (у 2014 годзе — трое).

На спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя» ў Мазырскім педагагічным універсітэце прахадны бал склаў 315 (у 2014 годзе — 132); на «Лагапедыі» ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка — 279 (у 2014 годзе — 244); на «Гісторыі» ў БДУ — 292 (у 2014 годзе — 254); «Ядзерная фізіка і тэхналогіі» ў БДУ — 222 (у 2014 годзе — 169).

А нуль балаў былі атрыманы па выніках ЦТ у 237 выпадках: большасць з іх прыпала на матэматыку (149) і фізіку (61).

Мінімальныя прахадныя балы для атрымання вышэйшай адукацыі за кошт сродкаў бюджэту былі зафіксаваны ў 2015 годзе па спецыяльнасцях «Заатэхнія» — 87 (у Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі), «Праектаванне і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі» — 93 (у Гомельскім тэхнічным універсітэце імя Сухога), «Авіяцыйныя радыёэлектронныя сістэмы» — 93 (у Ваеннай акадэміі), «Абсталяванне і тэхналогія зварачнай вытворчасці» — 96 (у Беларуска-Расійскім універсітэце).

## ДЛЯ ПЛАТНАГА НАВУЧАННЯ АБІТУРЫЕНТАЎ НЕ ХАПІЛА

На платную форму навучання ў дзяржаўныя і прыватныя ВНУ было прынята 29,6 тысячы чалавек. Незапоўненымі ў дзяржаўных ВНУ засталіся 1178 платных месцаў на дзённай форме навучання, або 9,2 працэнта ад плана, і 968 месцаў — на завочнай форме, або 6,8 працэнта ад плана.

Лічбы прыёму на ўмовах аплаты (на дзённай і завочнай формах навучання) выканалі толькі ВНУ Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства спорту, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. А план прыёму ў прыватныя ўстановы вышэйшай адукацыі быў выкананы ў 2015 годзе на 46 працэнтаў (летась ногул толькі на 25 працэнтаў). Найлепшы паказчык выканання лічбаў прыёму сярод прыватных устаноў вышэйшай адукацыі — у Гомельскага ўніверсітэта спажыўкааперацыі: на дзённай форме — 69,2 працэнта і на завочнай — 99,5 працэнта.

Вадзім Богуш паведаміў, што ў бягучым годзе ўстановы вышэйшай адукацыі, асабліва тыя, у структуры якіх знаходзяцца каледжы, пашырылі падрыхтоўку ў скарочаныя тэрміны на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі (на 0,9 працэнта). Дадзеную практыку плануецца прадоўжыць і ў 2016 годзе.

У наступным годзе аб'ёмы падрыхтоўкі на ўсіх узроўнях атрымання адукацыі плануецца захаваць **на ўзроўні факта прыёму бягучага года.** Выключэнне складаюць аб'ёмы падрыхтоўкі на дзённай форме атрымання вышэйшай адукацыі ў прыватных установах — іх прапануецца захаваць **на ўзроўні плана прыёму 2015 года.**

Між іншым, колькасць выпускнікоў сярэдніх школ пачне пакрысе прырастаць: калі сёлета са школ выйшлі 54 тысячы адзінаццацікласнікаў, то ў наступным годзе іх будзе ўжо 57,9 тысячы чалавек.

Пры фарміраванні кантрольных лічбаў прыёму на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі плануецца прадугледзець павелічэнне перыядычнасці прыёму па малазапатрабаваных спецыяльнасцях, устанавіўшы пры гэтым прыярытэт для тых, дзе сістэматычна не задавальняюцца заяўкі ад арганізацый — заказчыкаў кадраў. Адбывацца гэта будзе за кошт скарачэння кантрольных лічбаў прыёму па незапатрабаваных эканомікай спецыяльнасцях.

**Міністэрства адукацыі прапануе ўвесці ў Правілы прыёму норму, якая забяспечыць права на залічэнне без уступных выпрабаванняў на востразапатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці некаторым катэгорыям абітурыентаў: пераможцам міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд па вучэбных прадметах, якія адпавядаюць другому профільнаму іспыту, і абітурыентам-медалістам або выпускнікам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія маюць дыплом з адзнакай.**

Каб выканаць заказ на падрыхтоўку спецыялістаў, у тым ліку і па спецыяльнасцях, па якіх на працягу апошніх трох гадоў і болей не задавальняюцца заяўкі ад арганізацый — заказчыкаў кадраў, Міністэрства адукацыі прапануе ўвесці ў Правілы прыёму норму, якая забяспечыць права на залічэнне без уступных выпрабаванняў на востразапатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці некаторым катэгорыям абітурыентаў: пераможцам міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд па вучэбных прадметах, якія адпавядаюць другому профільнаму іспыту, і абітурыентам-медалістам або выпускнікам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія маюць дыплом з адзнакай.

Вадзім Богуш упэўнены, што ўвядзенне такой нормы не толькі павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, але і знізіць рызыку фарміравання малакамплектных навучальных груп.

**Найбольш запатрабаваныя спецыяльнасці на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў 2015 годзе:**

**«Пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя, дарожныя машыны і абсталяванне»: конкурс — 10,2 чалавека на месца;**
**«Архітэктура»: конкурс — 10 чалавек на месца;**
**«Вылічальныя машыны, сістэмы і сеткі»: конкурс — 8,8 чалавека на месца;**
**«Дызайн»: конкурс — 8,8 чалавека на месца;**
**«Правазнаўства» — 8 чалавек на месца;**
**«Банкаўская справа» — 7,4 чалавека на месца;**
**«Медыка-прафілактычная справа» — 7 чалавек на месца;**
**«Цырульніцкае майстэрства і дэкаратыўная касметыка» — 6 чалавек на месца;**
**«Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 5,8 чалавека на месца;**
**«Лінгвістычнае забеспячэнне сацыякультурнай дзейнасці» — 5,6 чалавека на месца.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# АД СУБСТАНЦЫІ — ДА ГАТОВЫХ ЛЕКАЎ

**Урачыстае адкрыццё мадэрнізаванай вытворчасці фармацэўтычных субстанцый і лекавых сродкаў адбылося ва ўнітарным прадпрыемстве «Унітэхпрам» БДУ.**

Мадэрнізацыя праводзілася ў рамках праекта «Стварэнне малатанажнай вытворчасці фармацэўтычных субстанцый для атрымання проціпухлінных, кардыятропных і іншых лекавых сродкаў, якія адпавядаюць стандартам GMP, на базе арганізацый Мінадукацыі». Гэты праект уключаны ў Дзяржаўную праграму па выпуску імпартазамяшчальнай фармацэўтычнай прадукцыі: яго рэалізацыя была разлічана на 2013—2015 гады.

У выніку рэканструкцыі адкрыты і аснашчаны высокатэхналагічным абсталяваннем два ўчасткі: па вытворчасці проціпухлінных субстанцый і лекавых сродкаў і ўчастак па вытворчасці кардыятропнай субстанцыі «Нітаргал».

Наменклатура плануемай да вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі «Унітэхпрам» БДУ ўключае арыгінальны супрацьпухлінны лекавы сродак «Цысплацэл», джэнерычную субстанцыю «Тэмазаламід», супрацьпухлінны прэпарат для лакальнай хіміятэрапіі пухлін галаўнога мозга высокай ступені злаякаснасці «Тэмодэкс» і антыангінальны прэпарат «Нітаргал». Гэтыя прэпараты маюць сусветную навізну і патэнтную абарону ў Беларусі і Расіі.

Спажыўцом фармацэўтычных субстанцый, якія выпускаюцца ва «Унітэхпраме», з'яўляецца прадпрыемства «Белмедпрэпараты», дзе вырабляюцца канчатковыя лекавыя формы. Такім чынам, у Беларусі забяспечваецца поўны цыкл: ад атрымання фармацэўтычнай субстанцыі да выпуску гатовай прадукцыі. Гэта дазваляе забяспечыць частковае імпартазамяшчэнне проціпухлінных прэпаратаў і лячэбных сродкаў з антыішэмічным і антыгіпертэнзіўным эфектамі і лекавую бяспеку дзяржавы.

Фінансаванне распрацоўкі ажыццяўлялася са сродкаў інавацыйных фондаў Мінгарвыканкама, Міністэрства адукацыі Беларусі і за кошт уласных сродкаў «Унітэхпрама» БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПІРАТЭХНІКУ — ПАД КАНТРОЛЬ

**Напярэдадні навагодніх свят супрацоўнікі Мінгандлю, МНС і МУС сумесна праводзяць кантрольныя мерапрыемствы па месцах продажу піратэхнікі.**

У гэтай сувязі Міністэрства гандлю нагадвае, што рэалізацыя піратэхнічных вырабаў не дапускаецца ў гандлёвых аб'ектах, якія не з'яўляюцца крамамі ці павільёнамі, гэта значыць, што яны не могуць прадавацца, напрыклад, у неізаляваных гандлёвых пунктах, кіёсках, палатках, з рухомых сродкаў развазнога гандлю. Апроч таго, колькасць піратэхнічных вырабаў у месцы продажу (у тым ліку ў складскіх памяшканнях крамаў, павільёнаў) не павінна перавышаць 50 кілаграмаў.

Пакупнікам пры набыцці піратэхнікі трэба звяртаць увагу на наяўнасць сертыфіката адпаведнасці, які можна патрабаваць у прадаўца. Упакоўка вырабу павінна быць без пашкоджанняў з абавязковай наяўнасцю інструкцыі па яго выкарыстанні, адраса і тэлефона вытворцы. Нелегальных прадаўцоў піратэхнічных вырабаў чакаюць штрафы: для фізічных асоб — ад 10 да 50 базавых велічынь, індывідуальных прадпрымальнікаў — ад 10 да 200 базавых, юрыдычнай асобы — да 500 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СКАНЕР БАЧЫЦЬ УСЁ

**У аўтадарожным пункце пропуску «Брузгі» на беларуска-польскай мяжы распачаў працу новы інспекцыйна-аглядны комплекс «Рапіскан».**

Ён значна паляпшае якасць мытнага кантролю грузавікоў і пры гэтым іх агляд у параўнанні з ранейшай сістэмай патрабуе значна менш часу. Сканаванне аўтамабіля і грузаў займае адну хвіліну, а ўвесь кантрольны працэс — не больш за дзесяць. За змену комплекс без ускрыцця і разгрузкі машыны, дэмантажу яе элементаў (супрацоўнік мытні ўсё бачыць на маніторы камп'ютара) здольны абслужыць 120 адзінак тэхнікі.

У гэты праект інвеставана каля 2,4 мільёна еўра сродкаў Еўрасаюза па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Беларусь — Украіна» і больш за 20 мільярдаў рублёў з рэспубліканскага бюджэту.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## МЯНТУЗ ІДЗЕ НА НЕРАСТ

**Згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, з 25 снежня па 28 лютага ў краіне ўстанаўліваецца забарона на лоўлю звычайнага ментуза.**

— Робіцца гэта ў мэтах захавання рыбных рэсурсаў і стварэння спрыяльных умоў для ўзнаўлення рыбы: зараз мянтуз будзе нерасціцца, — распавёў старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей. — За здабычу рыбы ў забаронены час прадугледжаны штраф у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй прылад здабычы рыбы і іншых прадметаў, што сталі прыладай ці сродкам здзяйснення парушэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РЭКЛАМЫ Ў ІНТЭРНЭЦЕ СТАНЕ МЕНШ?

**Паводле інфармацыі старшыні Асацыяцыі інтэрактыўнай рэкламы Аляксандра ВАСІЛЕВІЧА, аб'ём рынку інтэрнэт-рэкламы ў Беларусі па выніках 2015 года складзе каля 18 млн долараў.**

Пры дасягненні гэтай сумы ён упадзе на 15% у параўнанні з папярэднім годам. У Расіі падзенне чакаецца на ўзроўні 30-40%. Як адзначае Аляксандр Васілевіч, рэкламны рынак краіны зараз перажывае структурныя змены. Розніца паміж аб'ёмамі тэлевізійнай і інтэрнэт-рэкламай скарачаецца. У найбліжэйшай будучыні асацыяцыя зоймецца прасоўваннем інтэрактыўных метадаў рэкламы.

Беларуская Асацыяцыя інтэрактыўнай рэкламы (IAB Belarus) была створана сёлета і з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй. Яе асноўная мэта — развіваць галіну з дапамогай інтэграцыі айчыннага рынку ў сусветны.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

## ГРУЗАВІКАМ НЕ МЕСЦА Ў ЖЫЛОЙ ЗОНЕ

**Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя ўзмацняе кантроль за захаваннем правілаў спынення і стаянкі грузавых транспартных сродкаў у жылых зонах.**

— З пачатку года за такое правапарушэнне да адміністрацыйнай адказнасці было прыцягнута амаль паўтары тысячы кіроўцаў, — паведамілі ў прэс-службе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама. — Нагадаем, што, у адпаведнасці з пунктам 137.5 Правілаў дарожнага руху, у жылой і пешаходных зонах, на прылеглай тэрыторыі забараняецца стаянка грузавых аўтамабіляў, аўтобусаў, колавых трактароў і спецыяльных машын па-за спецыяльна адведзенымі месцамі, абазначанымі дарожным знакам «Месца стаянкі», калі гэта не звязана з выкананнем імі работ. Трэба разумець, што, пакідаючы грузавы аўтамабіль у двары, вы ствараеце не толькі нязручнасці для іншых кіроўцаў, але і падвяргаеце небяспецы жыцці пешаходаў, асабліва дзяцей. Яны, выходзячы з-за грузавога транспарту, часта робяцца нябачнымі для кіроўцаў. За незахаванне Правілаў дарожнага руху прадугледжаны штраф — пяць базавых велічынь, пры паўторным парушэнні цягам года — дзесяць базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УЛАЗІНЫ ДЛЯ КАРОВАК

**У аграгарадку Карма Добрушскага раёна 300 каровак толькі што пераведзены ў новае памяшканне. На малочнатаварнай ферме «Кудлаёўка» СВК «Абарона» ўведзены ў эксплуатацыю кароўнік для жывёлы. Ён пабудаваны за Br17 млрд 83 млн, выдаткаваных з рэспубліканскага бюджэту, расказаў загадчык сектара інтэнсіфікацыі вытворчасці ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Добрушскага райвыканкама Уладзімір Зубараў.**

Гэта другі такі вытворчы будынак, уведзены ў гаспадарцы сёлета. Вялізны хлеў з пластыкавымі вокнамі знутры добра ўцеплены. Дзённае святло ў памяшканне для жывёл пранікае праз вокны на даху. Дарэчы, на Добрушчыне аналагічны будынак сёлета адкрыты і ў таварыстве «Уцеўскае». Ён абышоўся дзяржаве ў звыш Br16,5 млрд. А жывёлаводы СВК «Баршоўскі» зусім нядаўна адзначылі ўлазіны аразу ў пяць вытворчых памяшканняў новай фермы агульным коштам звыш Br100 млрд. Цяпер тут чакаюць, што дойны статак з 660 галоў адгукнецца на клопат гаспадароў павелічэннем колькасці малака.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Нашы дзеці

# ЦУДЫ ЗДАРАЮЦЦА

## Абласныя галоўныя ёлкі прайшлі ўчора на Міншчыне, Гомельшчыне, Віцебшчыне і Брэстчыне

**Гэтыя святы цудаў з'яўляюцца адными з галоўных падзей рэспубліканскай навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» ў рэгіёнах. На ёлкі былі запрошаныя хлопчыкі і дзяўчаткі са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, сіроты, інваліды, а таксама пераможцы алімпіяд, творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў, актывісты грамадскіх дзіцячых арганізацый.**

### «НАВАГОДНІ ВЕРНІСАЖ» У БАРЫСАВЕ

Дабрачыннае свята «Навагодні вернісаж» прайшло ў Барысаве з удзелам **старшыні Мінаблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ.** Усяго на яго з'ехалася 900 чалавек ва ўзросце ад 8 да 16 гадоў з усіх куткоў Міншчыны. Сямён Барысавіч павіншаваў удзельнікаў з Новым годам і Калядамі, а таксама ўручыў ім падарункі.

У гэты дзень на вуліцах Барысава дзеці маглі знайсці шмат забаў. Для іх працавалі гульнявыя пляцоўкі, Дзед Мароз са Снягуркай ды казачнымі персанажамі ладзілі розныя конкурсы, спаборніцтвы. А ў Палацы культуры імя М. Горкага адбыўся тэатралізаваны паказ па матывах казкі «Шчаўкунок». Упершыню ў межах мерапрыемства па ініцыятыве ўпраўлення адукацыі аблвыканкама прайшло ўрачыстае ўшанаванне найлепшых навучэнцаў рэгіёна: 25 хлопчыкаў і дзяўчатак удастоены звання «Вучань года Мінскай вобласці—2015».

### ЛІХТАРЫКІ ДАБРА Ў ГОМЕЛІ

Вынікі акцыі «Дзеці — дзецям» падвялі на галоўнай навагодняй ёлцы Гомельшчыны.

26 вялізных пакункаў, якія прывезлі ў абласны цэнтр дэлегацыі кожнага з раёнаў, хутка будуць перададзены тым юным жыхарам вобласці, якія маюць у іх самую вялікую патрэбу: выхаванцам дзіцячых дамоў і маленькім хворым у лячэбных установах.

У кожнай падарачнай скрыні — кнігі, пазлы, канцылярскія тавары, гульні, мяккія цацкі, канструктары... Школьнікі збіралі гэтыя разнастайныя прадметы з упэўненасцю, што яны абавязкова спатрэбяцца. Дарэчы, як і добрыя справы, справаздачу якім ладзілі падчас абласной ёлкі. Дзеці, якія сталі ўдзельнікамі навагодняга спектакля, запальвалі «ліхтарыкі дабра» і адначасова расказвалі пра станоўчыя ўчынкі, якія атрымалася здзейсніць сёлета. **Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК** падзякаваў дзецям за тое, што сваімі поспехамі — калектыўнымі і асабістымі — яны праслаўляюць вобласць:

— Прыемна, што па якасці адукацыі, па колькасці заваяваных нашымі дзецьмі дыпломаў Гомельская вобласць лічыцца адной з найлепшых у краіне. Дзеці — самае дарагое, што ў нас сёння ёсць. Гэта наша будучыня. Таму хочацца пажадаць ім здароўя, творчасці, дабрабыту, каб у іх была толькі светлая будучыня. Святло ад вашых добрых спраў, добраахвотніцкай дзейнасці, сацыяльных праектаў зрабіла навагоднія агні яшчэ больш яркімі, а дасягненні ўвайшлі ў гісторыю. Кожны год пакідае за сабой шэраг рэалізаваных праектаў, набытыя сяброўскія сувязі і прыемныя моманты. Няхай і ў наступным годзе перад вамі адкрыюцца новыя магчымасці, скарацца новыя вяршыні.

Дзесяці вучням — пераможцам і лаўрэатам міжнародных, рэспубліканскіх, абласных творчых конкурсаў — з рук губернатара дасталіся каштоўныя падарункі. Ангеліна Пархоменка прыехала на свята з Калінкавіч. Яна — сярод лідараў краіны ў спартыўным арыентаванні. Дзяўчына гаворыць, што спорт ёй у вучобе не перашкаджае — у дзённіку толькі выдатныя адзнакі.

Яраслаў Даніленка займаецца ў Гомельскім абласным эколага-біялагічным цэнтры дзяцей і моладзі. Яго навуковыя работы па геабатаніцы і экалогіі заўважаны і на рэспубліканскім узроўні:

— Прыемна, што нас узнагародзілі, гэта дае матывацыю на новыя дасягненні, на ўдзел у новых праектах і конкурсах.

1400 дзяцей прынялі ўдзел у губернатарскай ёлцы, якая прайшла ў Гомельскім дзяржаўным цырку. Агульным падарункам для ўсіх стала шоу з удзелам экзатычных жывёл, сярод якіх малпа, дзікабраз, вярблюды і нават марскія львы. Ну а Снягурку на арэну пад шчырыя апладысменты дзяцей вывез сапраўдны слон.

### ЧАРАЎНІЦТВА КРАІНЫ ОЗ

Зарад чароўных сіл для новых здзяйсненняў атрымалі найлепшыя школьнікі Прыдзвіння на абласным дабрачынным свяце ў Віцебску. «Зімовыя вакацыі прыносяць нам калядныя і навагоднія святы, пах ялінкі, упрыгожанай гірляндамі і прыгожымі цацкамі, падарункі. Тут сёння сабраліся самыя лепшыя — тыя, хто сваёй працай і вучобай услаўляе сябе і сваю сям'ю, нашу вобласць, Рэспубліку Беларусь», — вітаў гасцей **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ.**

Галоўная ёлка рэгіёна сабрала ў канцэртнай зале «Віцебск» каля 1 тыс. школьнікаў з розных куткоў вобласці. «Сёння, каб быць адукаваным чалавекам, недастаткова ўмець толькі чытаць і пісаць. Трэба авалодаць і эканамічнай пісьменнасцю, і экалагічнай, і камп'ютарнай, і прававой. І тут на дапамогу прыходзяць педагогі, чый уклад неацэнны. Дзякуючы вам 104 хлопчыкі і дзяўчынкі нашай вобласці сёлета сталі стыпендыятамі фонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Прыемна, што 80 нашых дзяцей сталі пераможцамі рэспубліканскай алімпіяды па розных прадметах», — адзначыў намеснік старшыні аблвыканкама.

Дзеці сталі гледачамі інтэрактыўнага мюзікла «Чараўніцтва Краіны Оз», падрыхтаванага цэнтрам культуры «Віцебск», пагутарылі за святочным сталом і, вядома, атрымалі навагоднія падарункі. Як заўважыла адна з гасцей з Полацка, вучаніца гімназіі №1 Марыя Якімава, якая трапіла на такое мерапрыемства ўпершыню, у любым узросце гэтае свята застаецца самым доўгачаканым, таму што дорыць надзею і веру ў цуд. Педагог Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Першамайскага раёна Віцебска Марына Бараноўская дадала, што вера ў цуды і самі дзяцей ператварае ў чараўнікоў, здольных здзіўляць, дасягаць неверагодных вяршыняў, даючы прыклад іншым.

### ПЯРО ЖАР-ПТУШКІ

Гасцямі дабрачыннага навагодняга свята ў Брэсце сталі 450 дзяцей з усіх раёнаў вобласці.

Навучэнцы Брэсцкага цэнтра маладзёжнай творчасці падрыхтавалі для сваіх аднагодкаў казачны спектакль «Новы год і пяро Жар-птушкі», танцавальна-забаўляльную праграму каля ёлкі. Кожнае дзіця атрымала салодкі падарунак. «У гэтыя святочныя дні мы павінны зрабіць усё магчымае, каб дзеці не адчувалі сябе адзінокімі, абдзеленымі клопатам. Асаблівая ўвага надаецца сіротам і тым, у каго праблемы са здароўем. У Брэсцкай вобласці ў акцыі «Нашы дзеці» возьмуць удзел больш за 30 тыс. хлопчыкаў і дзяўчынак. Мы наведаем іх у сем'ях, установах адукацыі і аховы здароўя. Прадпрыемствы, арганізацыі і бізнесмены рэгіёна таксама актыўна прымаюць удзел у дабрачыннай акцыі», — адзначыў на абласным дабрачынным свяце **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.** Напярэдадні Новага года прынята падводзіць вынікі. Паводле слоў губернатара, 2015-ы для маленькіх жыхароў Брэсцкай вобласці выдаўся паспяховым. Рэгіён займае лідзіруючыя пазіцыі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання, рэспубліканскага этапу прадметных алімпіяд; другі год запар утрымлівае другое месца ў топ-100 школ краіны. Таксама Анатоль Ліс паведаміў, што ў 2016 годзе ў рэгіёне будзе рэалізаваны шэраг сацыяльна значных праектаў. Завершыцца будаўніцтва спальнага корпуса дзіцячага рэабілітацыйнага цэнтра «Тонус», інфекцыйнага корпуса абласной бальніцы (дзе ў тым ліку будзе працаваць дзіцячае аддзяленне), дзіцячага сада-школы ў Брэсце. Таксама будуць выдзелены сродкі на ўзвядзенне дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, працягнецца рэканструкцыя брэсцкага тэатра лялек.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,**
**Ірына АСТАШКЕВІЧ,**
**Надзея ПАЎЛАВА.**

# КАБ ЯНЫ ЎСМІХАЛІСЯ!..

## Дабрачынная навагодняя акцыя працягваецца



Фота БЕЛТА.

**Учора падарункі ў Мінскі гарадскі цэнтр медыцынскай рэабілітацыі дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі прывёз старшыня КДБ Валерый ВАКУЛЬЧЫК. «Усмешкі на шчаслівых тварах малечы не пакідаюць абыякавымі. Дзеля чаго мы працуем? Дзеля будучыні нашых дзяцей, каб яны жылі ў свабоднай і незалежнай краіне, былі шчаслівыя», — заўважыў Валерый Вакульчык. Цэнтру рэабілітацыі супрацоўнікі камітэта перадалі мэблю, набытую за сродкі органаў дзяржаўнай бяспекі.**

**Дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Аляксей ДЗЕРБІН** наведаў Рудзенскую дапаможную школу-інтэрнат для сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў. Для ўстановы закупілі тэхніку і іншыя неабходныя рэчы. А выхаванцаў сталічнага дзіцячага дома №7 павіншаваў **старшыня праўлення Банка развіцця Сяргей РУМАС** (два гады таму арганізацыя ўзяла шэфства над гэтым дзіцячым домам).

На галоўнай прафсаюзнай ёлцы ў Дварцы культуры прафсаюзаў учора сабралі амаль паўтысячы дзяцей. Сярод іх — выхаванцы дзіцячых дамоў, сацыяльных прытулкаў, малыя са шматдзетных сем'яў. **Старшыня ФПБ Міхаіл ОРДА,** які таксама прысутнічаў на ўрачыстым мерапрыемстве, адзначыў, што, каб зладзіць гэта свята, свой унёсак зрабілі многія работнікі нашай краіны. «Дарослыя чакаюць Новы год не менш, чым дзеці, каб спраўдзіць іх надзеі і мары». Ужо больш за дзесяць гадоў федэрацыя праводзіць дабрачынную акцыю «Прафсаюзы — дзецям». Агульная сума шэфскай дапамогі з 2002 года склала больш за 29 мільярдаў рублёў (без уліку фінансавай падтрымкі для падрыхтоўкі малых да школы). У перыяд навагодніх і калядных мерапрыемстваў 2014-2015 гадоў прафсаюзы ахапілі 175 дзіцячых устаноў і выдаткавалі на іх патрэбы больш за чатыры мільярды рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# НЕ ПРОСТА ШЭФЫ, А СЯБРЫ



Фота Дар'і Рэвы.

**Яшчэ задоўга да пачатку навагодняга балю выхаванцы «SOS — Дзіцячая вёска Мар'іна Горка» пачалі збірацца ў актавай зале. А нагода для гэтага сапраўды была: яны чакалі гасцей — першага намесніка міністра інфармацыі Ігара ЛУЦКАГА. Міністэрства інфармацыі ўжо не першы год шэфствуе над дзіцячай установай. Як адзначыў яе дырэктар Дзмітрый Калтовіч, дзеці лічаць прадстаўнікоў міністэрства не шэфамі, а сябрамі.**

А сяброў звычайна сустракаюць усім найлепшым, расказваюць пра свае поспехі і дасягненні, паказваюць таленты. Да свята дзеці разам з мамамі і выхавальнікамі падрыхтавалі тэатралізаваны паказ, вывучылі новыя песні, вершы. І, вядома, упрыгожылі шыкоўную ёлку. Ігар Уладзіміравіч не толькі вадзіў з малымі карагоды вакол зялёнай прыгажуні, але і ўдзельнічаў у конкурсах, гульнях.

— Мае дзеці ўжо выраслі, таму карагоды даўно не вадзіў з імі. Але я з вялікім задавальненнем уцягнуўся ў працэс, для мяне гэта цікава, — усміхаецца Ігар Луцкі. — Калі бачыш, што дзеці шчыра радуюцца, то як не прыняць удзел у іх гульнях, не падаць ім руку, не падставіць плячо.

Міністэрства інфармацыі таксама купіла малым салодкія падарункі. Трэба было бачыць, з якой цікавасцю, ззяючымі вачамі яны выстройваліся ў чаргу па прыгожыя пакеты з рознымі прысмакамі.

Дадам, што супрацоўнікі міністэрства згадваюць пра сваіх падшэфных не толькі напярэдадні свят. У прыватнасці, арганізуюць для дзяцей паездкі на розныя прадпрыемствы. Такія экскурсіі даюць магчымасць азнаёміцца з рознымі прафесіямі і ў будучыні выбраць справу па душы.

— Мы дапамагаем не толькі дзіцячай вёсцы ў Мар'інай Горцы, але і іншым установам, — адзначыў Ігар Луцкі. — Напрыклад, сёлета міністэрства правяло чацвёрты па ліку дабрачынны Калядны баль кнігі, дзе сабралі амаль 54 млн рублёў. Сродкі пералічылі на рахунак Журавіцкага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў. Мы лічым, што клопат пра дзяцей — вельмі важны і павінен быць першачарговым. Менавіта за імі будучыня краіны. Мы, дарослыя, павінны паказваць ім сваім прыкладам, чаго дасягнулі самі і да чаго трэба імкнуцца.

Усяго ж у дзіцячай вёсцы ў Мар'інай Горцы выхоўваюцца 72 гадаванцы. Гэта самая вялікая ўстанова такога тыпу ў Беларусі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# СВЯТА — КОЖНАМУ ДЗІЦЯЦІ!

**Падчас дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў павіншавалі з зімовымі святамі выхаванцаў Радашковіцкай школы-інтэрната.**

Чаканых гасцей дзеці сустрэлі святочным ранішнікам з удзелам Бураціна, Мальвіны, лісы Алісы, ката Базіліа, Карабаса-Барабаса і іншых вядомых персанажаў. У адказ артысты ансамбля песні і танца ўнутраных войскаў МУС павіншавалі прысутных з надыходзячым Новым годам невялічкім канцэртам.

— Для кожнага Новы год — гэта свята. Асабліва для дзяцей. І кожны год напярэдадні свята, каб павіншаваць дзяцей, кіраўніцтва міністэрства наведвае школу-інтэрнат у Радашковічах, — кажа **намеснік міністра ўнутраных спраў Аляксандр КОБРУСЕЎ**. — На працягу многіх гадоў МУС рэгулярна аказвае дапамогу гэтай навучальнай установе. Сёлета мы адрамантавалі хакейную пляцоўку. Думаю, што зімовае надвор'е яшчэ стабілізуецца і дзеці ёй скарыстаюцца.

— Супрацоўнікі МУС — нашы пастаянныя госці, — падкрэслівае Ігар Дзятлоўскі, дырэктар школы-інтэрната, між іншым, адзінай у Мінскай вобласці. — Наша дружба цягнецца больш за 30 гадоў. І кожны год мы атрымліваем ад міністэрства дапамогу. Школа цалкам абсталявана трыма спартыўнымі базамі: хакейнай, лыжнай і веласіпеднай. Увесь спартыўны інвентар — падарунак ад МУС. Выхаванцы таксама сёлета наведваюць усе хатнія матчы хакейнага клуба «Дынама» (Мінск). Аднак самы галоўны падарунак — гэта ўвага, камунікаванне. Многія супрацоўнікі міліцыі сябруюць з нашымі дзецьмі. Яны ездзяць да іх на канікулы, выхадныя. І мы вельмі ганарымся, што ў МУС ёсць наш супрацоўнік. У Валожынскім раённым аддзяленні ўнутраных спраў служыць наш выхаванец Аляксей Рабовіч, які летась скончыў Акадэмію ўнутраных спраў.

**Тарас ШЧЫРЫ,** *taras@zviazda.by*



Фота Альберта ЕРМАКОВА.

# СПЯШАЙЦЕСЯ РАБІЦЬ ДАБРО!

**— Мы клапоцімся пра тое, каб маленькія грамадзяне Беларусі жылі ў цяпле і дастатку, атрымлівалі новыя веды, вучыліся дабрыні і мужнасці, заўсёды знаходзілі абарону і дапамогу з боку дарослых, — такімі словамі вітаў учора старшыня Іўеўскага райвыканкама Аляксандр БУЛАК дзяцей, якія прыехалі на навагодняе дабрачыннае свята ў сядзібу дзеда Зімніка і бабы Завірухі ў вёсцы Залейкі.**

Гэта была цэнтральная падзея дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», якую мясцовыя работнікі культуры і адукацыі ўжо традыцыйна ладзяць у казачнай сядзібе для маленькіх наведвальнікаў са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, сірот, інвалідаў, выхаванцаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра і дзіцячага дома сямейнага тыпу, навучэнцаў — пераможцаў творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў.

Свята ў Залейках атрымалася на славу! 159 хлопчыкаў і дзяўчатак зведалі захапляльныя прыгоды на чароўнай сцежцы, сустрэліся з жыхарамі казачнага лесу — вядомымі фальклорнымі персанажамі, паглядзелі спектакль пад адкрытым небам і, зразумела, атрымалі салодкія падарункі ад Дзеда Мароза, у якасці «спонсараў» якога выступіў раённы бюджэт. А мясцовыя рамеснікі вырабілі эксклюзіўныя сувеніры.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# НА ЛЫЖАХ У АНГЛІЮ, НА АЎТАМАБІЛІ — У АФРЫКУ

## Дзеці з парушэннямі слыху падарожнічалі і спявалі праз жэсты

**Канцэрт з жэставых песень, танцаў, пантамімы і іншых нумароў, святочныя прычоскі ў салоне прыгажосці «У Снягуркі», прыгожыя часовыя тату ад салона «Снежная каралева», выстаўка ёлак з бісеру, паперы, лямпачак, нітак і тканіны... Такімі цікавымі мерапрыемствамі ў спецыяльнай школе-інтэрнаце №13 г. Мінска для дзяцей з парушэннямі слыху сустракалі міністра адукацыі Беларусі Міхаіла ЖУРАЎКОВА і іншых гасцей, якія наведалі ўстанову ў межах акцыі «Нашы дзеці».**

У святочным канцэрце, падрыхтаваным выхаванцамі школы, змаглі паўдзельнічаць і гледачы. Пад кіраўніцтвам Дзеда Мароза і Снягуркі паміж выступленнямі юных талентаў усе прысутныя дружна адпраўляліся ў падарожжа па свеце. Уставалі з месцаў і на мігі паказвалі, як на лыжах рухаюцца ў Англію, пасля на аўтамабілі накіроўваюцца ў Афрыку, на цягніку едуць у Лацінскую Амерыку...

119 выхаванцаў школы — гэта ў асноўным дзеці са звычайных сем'яў. Больш за палову навучэнцаў бінаўральна пратэзаваныя — успрымаюць гукі пры дапамозе сучасных лічбавых слухавых апаратаў.

— *Настаўнікі займаюцца з дзецьмі ў групах, парах і індывідуальна. Для працы карыстаюцца рознымі сродкамі, у тым ліку і ўласнымі праграмнымі прадуктамі, распрацаванымі педагогамі школы. У 2011 годзе ў школе пачаўся эксперымент па вывучэнні дзецьмі з парушэннямі слыху беларускай мовы — цяпер гэта адзін з асноўных прадметаў у школьнай праграме,* — расказала **Галіна ГУРБО, дырэктар спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната.**

Міхаіл Жураўкоў падарыў школьнікам спецыяльныя развіваючыя гульні, якія дапамогуць ім лепш асвойваць розныя прадметы. Ён высока ацаніў працу педагогаў і дасягненні навучэнцаў:

— *Гэтая школа — прыклад не толькі для Беларусі, але і для іншых краін. Тут ёсць унікальнае абсталяванне, якое дапамагае навучэнцам не проста прыстасавацца да жыцця, а стаць паўнавартасным удзельнікам сацыяльнага жыццёвага працэсу.*

**Ірына СІДАРОК.**

■ Радзіме служыць!



# ГОДНАЯ ЗМЕНА

**КАЛЯ паўтары тысячы ваеннаслужачых унутраных войскаў па ўсёй Беларусі прысягнулі на вернасць Радзіме. Больш за 350 з іх — у вайсковай часці 5448, што ў Мінску.**

— У нас сёння свята. Новае папаўненне, прызванае з розных рэгіёнаў нашай краіны, прымае вайсковую прысягу на вернасць беларускаму народу, — кажа **палкоўнік Эдуард МІЦКЕВІЧ, камандзір вайсковай часці 5448.** — Гэта годная змена тым, каго звольнілі ў запас. Мы гатовы разам з імі выконваць любыя пастаўленыя задачы.

— Да службы ў войску заўжды ставіўся пазітыўна, — прызнаецца **Максім ШЛЕХЦЕРМАЕР,** які толькі-толькі агучыў клятву на вернасць Айчыне. — І я лічу, што такім чынам кожны мужчына павінен аддаць доўг сваёй Радзіме.

Пасля прысягі вайскоўцы адправіліся ў сваё першае звальненне, а ўжо з 24 снежня яны пачалі выконваць задачы па ахове грамадскага парадку сталіцы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Класныя навіны

### ІНТЭРАКТЫЎНАЯ МАТЭМАТЫКА

**У БДУ запушчаны новы інтэграваны адукацыйны праект «QualiMe» (quali.me/#about). Сучасная інтэрактыўная інтэрнэт-пляцоўка прызначана для тых, хто захоплены матэматыкай.**

З дапамогай сайта можна будзе ліквідаваць прабелы пры вывучэнні адпаведных раздзелаў матэматыкі, падрыхтавацца да здачы экзаменаў за курс базавай і сярэдняй школы, а таксама да цэнтралізаванага тэсціравання. Акрамя таго, у студэнтаў будзе магчымасць самастойна вывучаць асновы вышэйшай матэматыкі, а ў настаўнікаў і выкладчыкаў — распрацоўваць якасныя педагагічныя тэсты.

Інтэрнэт-рэсурс уключае ў сябе тры тэматычныя рубрыкі: «Інтэрактыўны даведнік па матэматыцы» (helpy.quali.me/), «Інтэрактыўны адукацыйны рэсурс для працы з тэстамі» (testy.quali.me /) і «Разлік і аналіз тэставых характарыстык» (tester.quali.me/). Структура першай рубрыкі складаецца з раздзелаў: «Даведачны матэрыял», «Прыклады», «Звярніце ўвагу» і «Мадэлі». Карыстальнікам другой старонкі прапануюцца тэсты, прызначаныя для саманавучання і карэкцыі ведаў: для школьнікаў, выпускнікоў школ і абітурыентаў — за курс матэматыкі сярэдняй школы, а для студэнтаў ВНУ — за курс асноў вышэйшай матэматыкі. А трэцяя старонка вэб-сайта навучыць парадку разліку і аналізу тэставых характарыстык.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Май на ўвазе!

# КАМФОРТНЫ І БЯСПЕЧНЫ АДПАЧЫНАК

**У навагоднюю ноч святочныя мерапрыемствы ахопяць больш чым 4,5 тысячы пляцовак па ўсёй тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым супрацоўнікі міліцыі ўзмоцняць меры бяспекі.**

— У месцах правядзення навагодніх і калядных свят арганізуюць прапускны рэжым, — кажа начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС Беларусі Ігар Гатальскі. — Наведвальнікаў і іх рэчы будуць аглядаць. У тым ліку з дапамогай тэхнічных, спецыяльных сродкаў.

Падчас правядзення масавых святкаванняў забараняецца мець пры сабе халодную, агнястрэльную, газавую зброю, узрыўчатку, муляжы і імітатары. Забаронена ўдзельнічаць у мерапрыемствах у стане алкагольнага ап'янення.

— Калі грамадзяне парушаюць грамадскі парадак і ўстаноўленыя законам патрабаванні, міліцыянеры маюць права патрабаваць ад іх пакінуць святочную пляцоўку, — заўважае Ігар Гатальскі. — Паколькі падобныя меры скіраваны выключна на забеспячэнне парадку, варта з разуменнем ставіцца да падобных дзеянняў міліцыі.

Што тычыцца працы ДАІ, у святочныя дні будзе ўзмоцнены нагляд за дарогамі, але абмяжоўваць рух, акрамя месцаў, дзе ладзяць масавыя мерапрыемствы, не плануюць.

— Аналіз дарожна-транспартных умоў сведчыць, што ў навагодні перыяд у краіне значна павялічваецца колькасць правапарушэнняў, звязаных з кіраваннем аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення, — кажа Ігар Гатальскі. — Вадзіцеляў не спыняе ні вялікі штраф, ні магчымасць застацца без правоў і нават аўтамабіля. Каб пазбегнуць падобных сітуацый, мы настойліва рэкамендуем устрымацца ад управлення аўто не менш, чым на суткі, пасля ўжывання спіртнога. І нават у невялічкай колькасці. У сваю чаргу супрацоўнікі міліцыі сарыентаваны на максімальна ветлівае і ўважлівае стаўленне да людзей, аказанне пры неабходнасці дапамогі, каб зрабіць адпачынак для нашых суайчыннікаў і гасцей краіны камфортным і бяспечным.

**Тарас ШЧЫРЫ,** *taras@zviazda.by*

■ Для прафілактыкі

# ШАМПАНСКАЕ... ДЛЯ ДОБРАЙ ПАМЯЦІ?

**Група замежных мікрабіёлагаў прадставіла даныя эксперыментаў, якія прымушаюць думаць, што ўмеранае ўжыванне шампанскага не пазбаўляе нас памяці, а... умацоўвае яе!**



Аўтары эксперыментаў сцвярджаюць, што фенолы (арганічныя злучэнні, якія ёсць у напоі) актыўна ўзаемадзейнічаюць з многімі групамі бялкоў галаўнога мозга, уцягнутымі ў працэсы захавання інфармацыі. Асабліва вялікая іх роля ў функцыянаванні прасторавай памяці — здольнасці арыентавацца ў прасторы і запамінаць размяшчэнне прадметаў. З узростам актыўнасць бялкоў зніжаецца, а фенолы прыпыняюць гэты працэс.

Падобныя эфекты выяўляліся і раней, аднак вучоныя звязвалі іх з дзеяннем іншых рэчываў — флаваноідаў, якіх шмат у чырвоным віне. Шампанскае ж небагатае на флаваноіды і, тым не менш, аказвае пазітыўны ўплыў на пазнавальныя функцыі мозга. І дзякаваць за гэта трэба фенолам. Такім чынам, ужыванне шампанскага папярэджвае некаторыя ўзроставыя парушэнні памяці, інтэлектуальнай дзейнасці. Але, як і ў выпадку з чырвоным віном, усё гэта, а таксама пазітыўны ўплыў на работу сэрца і сасудаў, прымяняецца толькі ў дачыненні да людзей, якія дасягнулі сталага ўзросту. Акрамя таго, размова ідзе літаральна аб 2 келіхах шампанскага на тыдні.

Урэшце, пазітыўным дзеяннем на памяць і кагнітыўныя здольнасці можа валодаць не толькі шампанскае, але і іншыя прадукты, багатыя на фенолы. Скажам, чарніцы, буякі, какава-бабы. Так што горкі шакалад з сухім шампанскім можа быць нядрэнным варыянтам прафілактыкі дэменцыі ■

■ Нельга не есці!

# НОЧКА ЎДАЛАСЯ,

## або Што там Малпа патрабуе?

**Можна зноў нагадаць асноўныя правілы здаровага ладу жыцця падчас навагодніх свят, але ёсць рызыка застацца не пачутымі. Таму спачатку паглядзім, што можна параіць нам з пункту гледжання ўласна свята, а пасля пагаворым аб пэўнай карэкціроўцы.**

Кажуць, навагодняя ноч гэтага года павінна быць шыкоўнай. І ў сервіроўцы стала, і ў стравах. Маўляў, на стол трэба паставіць усё настолькі дарагое, наколькі можна сабе дазволіць.

Дазваляецца не перабіраць з чырвоным колерам у адзенні — не трэба так ужо адразу шакіраваць малпачку. А вось стол ваш можа быць і з «тэмпераментам» — адценням чырвонага тут самае месца. Гатуйце або проста рэжце таматы, перцы, буракі (прывітанне, селядзец пад шубай!). Рабіце бутэрброды з чырвонай ікрой. Раскладвайце мандарыны, апельсіны, хурму, клубніцы.

Вельмі старое правіла падрыхтоўкі навагодняга стала — 12 розных страў, а лепей фруктаў (па адным сочным сімвале на кожны месяц). Вазьміце ананас, яблык, манга (яны сімвалізуюць шчасце), кавун і апельсін (да грошай), памела і персік (даўгалецце), лімон і ківі (ад негатыўных эмоцый), вінаград (сімвал раскошы) і папайю (моцнае здароўе). Выдатны кампраміс — канапэ на шпажках: нарэжце фрукты кавалачкамі і зрабіце з іх «шашлычкі». У цэнтр стала пакладзіце спелыя бананы і не забудзьцеся адкусіць падчас застолля хоць бы адзін кавалачак ад любімага фрукта малпы.

Дарэчы, паколькі малпы любяць салодкае, то на стале могуць быць і шакалад, і пасціла, і торт, і марожанае.

**У ідэале сёлета рэкамендуецца выдаліць з навагодняга меню мяса і рыбу, пакінуўшы на стале толькі прадукты расліннага паходжання.** Можаце гатаваць самыя розныя раслінныя салаты. Не забывайцеся на прыправы — гэта прыкмета таго, што год будзе «з перчыкам». Калі вы ўпарты мясаед, зрабіце выбар на карысць курыцы або індычкі. Проста малпа не ахвотніца да тлустай ежы.

Соку і морсу на сёлетнім стале самае месца. Хоць талісман гэтага года нічога не мае супраць шампанскага.

Малпа — жывёла актыўная, любіць стасункі, цікаўная, а таму давядзецца сустракаць год весела, гучна і пазітыўна. Каб суседзі пазайздросцілі і вырашылі далучыцца.

А цяпер час нагадаць і пра здаровы лад. Па праўдзе, той, хто ўвесь год жыў менавіта здарова, наўрад ці кінецца ва ўсе цяжкія і ў Новы год. Хто любіць бегаць, не злоўжывае алкаголем, не курыць, не пераядае, той і 1 студзеня не прапусціць любімую прабежку ці прагулку хуткім крокам. А той, хто яшчэ не «дарос» да падліку калорый, наўрад ці ў сам Новы год пачне рэвалюцыю ў харчаванні. Тым не менш, агульныя правілы ёсць сэнс агучыць. Не выключана, што іх асцярожнае прымяненне ў першы дзень года пакладзе пачатак вашаму аздараўленню. А што? **Робячы правільна, вы будзеце добра сябе адчуваць, вам гэта абавязкова спадабаецца і захочацца працягнуць.**

Усе дыетолагі ў адзін голас заклікаюць не галадаць напярэдадні ночы. Гэта здзек з арганізма, у якім адбываюцца пэўныя этапы стрававання незалежна ад таго, што мы самі сабе выдумалі. А таму — ешце! І найлепш з самай раніцы 31 снежня ешце тое, чаго хочацца больш за ўсё, а не тое, што ўжывалі цэлы год.

Пачынайце кожны прыём ежы са шклянкі вады.

Калі ў вас няма нейкіх асаблівых процілпаказанняў да ўжывання алкаголю, то дазвольце сабе хоць бы крыху шампанскага. Не адмаўляйцеся ад алкаголю ўвогуле. Калі плануеце ўжыць крыху больш за келіх, то не каштуйце больш за два віды алкагольных напояў. Запівайце алкаголь вялікай колькасцю звычайнай негазіраванай вады.

Як бы ні вабіла рэклама набыць салодкі газіраваны напой, стрымайце сябе і сваіх дзяцей. Купіце загадзя добры чай. Прыгатуйце яго з імбірам ці гваздзікам або зёлкавы. Піце ўсёй сям'ёй.

Не перабярыце з дэсертамі. Дастаткова аднаго-двух або нават толькі цукерак. Зрабіце самі або купіце самае смачнае. Захочаце паласавацца днём, дык не таміце сябе да ночы, адшчыкніце крыху.

Не гатуйце шмат страў. Нават калі збіраецца вялікая кампанія. Ніхто не кажа, што гасцей трэба пасадзіць за пусты стол. Але і шмат цяжкіх страў (тлустых, бульбяных, маянэзных), даруйце, ужо маветон.



**Усе дыетолагі ў адзін голас заклікаюць не галадаць напярэдадні ночы. Гэта здзек з арганізма, у якім адбываюцца пэўныя этапы стрававання незалежна ад таго, што мы самі сабе выдумалі.**

Што да ягад, фруктаў і гародніны, то стаўку трэба рабіць на разнастайнасць. Так удасца пазбегнуць пераядання адных толькі мандарынак (ці што вы там плануеце купіць у колькасці трох кілаграмаў?).

Ідэальны варыянт, калі раніцай не давядзецца «ўсё» даядаць. Штосьці можа і застацца, напрыклад, заліўны язык. Але яйкі, фаршыраваныя грыбамі, лепей з'есці свежымі.

Не пускайце сталаванне на самацёк. Прыбірайце брудны посуд, мяняйце стравы, прыбірайце тыя, да якіх страціўся інтарэс. Прапануйце адзін аднаму не ежу, а ваду і чай!

Раніцай наступнага (пасля сытнага свята) дня абавязкова выпіце дзве шклянкі вады. Можа быць, з алкаголем учора быў перабор? Тады актуальным будзе ўжыванне актываванага вуглю. Добра дапаможа і працяглы душ. **Не слухайце баек пра «дапамогу» расолу з-пад агуркоў. Чыстая вада, толькі яна! І як мага болей! Тады вы самі — свежы агурок!**

У святочна-выхадныя дні вашай задачай застаецца не толькі атрыманне задавальнення ад нейкіх нязвыклых страў, але, што больш важна, атрыманне пазітыўных эмоцый, актыўны адпачынак. Гуляйце па горадзе, сустракайцеся з сябрамі, але не перагрузіце сябе тусоўкамі. Не хочацца нікога бачыць? Вы ўжо на працы наактыўнічаліся? Што ж, адпачніце пасіўна, на канапе. Рабіце тое, што хочацца, і не рабіце таго, чаго не хочацца. Гэта і будзе сапраўднае свята. Такое, пасля якога з задавальненнем пачняце любімую работу. ■

■ Меры засцярогі

# КАТЛЕТЫ — АСОБНА...

**Попыт на прадукты харчавання ў перадсвяточныя дні расце, а значыць, ёсць рызыка набыць што-небудзь пратэрмінаванае і небяспечнае.**

Бываюць жа і несумленныя гандляры. Але мы будзем хітрэйшыя за іх — уважлівыя. Урач-гігіеніст Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія БАХУР заклікае быць уважлівымі да свайго выбару, набываць правераныя прадукты, правільна іх гатаваць і захоўваць.

Не купляйце прадукты ў месцах несанкцыянаванага гандлю. Асабліва кансервы хатняга гатавання, сушаныя грыбы, рыбу, мяса і сала хатняга вэнджання. Іх кошт, можа быць, і ніжэйшы, чым у магазіне, але рызыка харчовых атручэнняў значна вышэйшая. Акрамя таго, ужыванне такіх прадуктаў пагражае батулізмам.

Заўсёды ўважліва стаўцеся да набыцця прадуктаў, якія хутка псуюцца. Мясныя паўфабрыкаты, вараная каўбаса, салаты, тварог, малако, кандытарскія вырабы патрабуюць, каб вы абавязкова пацікавіліся тэрмінам прыдатнасці і ўмовамі іх захавання, прынамсі, ці працуе халадзільнае абсталяванне.

На ўпакоўцы малочных і кісламалочных прадуктаў, сокаў, салатаў прамысловай вытворчасці ўказваецца тэрмін прыдатнасці, разлічаны на закрытую ўпакоўку. Варта яе адкрыць — і ён значна скароціцца. Той жа сыр у герметычнай заводскай упакоўцы і сыр, парэзаны і ўпакаваны ва ўмовах арганізацыі гандлю, будзе мець розны час захавання.

Калі ў вас з'явіліся нейкія сумненні адносна якасці прадукту, не набывайце яго. Захоўвайце набытае так, як рэкамендавана на ўпакоўцы. Не можаце прачытаць, што там пазначана, — звярніцеся да прадаўца, які абавязаны даваць поўную інфармацыю пра тавар.

Падчас гатоўкі ў першую чаргу вытрымлівайце правілы асабістай гігіены, сачыце за чысцінёй у памяшканні. Часцей мыйце рукі, працірайце кухонныя паверхні.

У халадзільніку не кладзіце на адну паліцу сырую і гатовую ежу.

Калі не плануеце адразу гатаваць мяса, пакладзіце яго ў маразільнік.

Гатуйце як след мяса, яйкі і ўсё іншае для святочных страў.

Не карыстайцеся адным і тым жа інвентаром пры нарэзцы сырой і гатовай прадукцыі.

Рэшткі страў як мага хутчэй прыбярыце ў халадзільнік.



**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
___________________ С.А.Сушко
28.12.2015

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ об открытой продаже облигаций Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк» четвертого выпуска

**Раздел 1**
**ОБЩИЕ СВЕДЕНИЯ ОБ ЭМИТЕНТЕ**

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

Наименование эмитента на белорусском языке:
полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Беларускі народны банк»;
сокращенное: ААТ «БНБ-Банк»;
наименование эмитента на русском языке:
полное: Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк» (в дальнейшем именуемое «Банк», «Эмитент»);
сокращенное: ОАО «БНБ-Банк».

**2. Место нахождения, телефон, факс, адрес электронной почты и web-сайта эмитента**

Республика Беларусь, 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 87а;
телефон: (017) 309 7 309; факс: (017) 280 74 47;
e-mail: bnb@bnb.by;
web-сайт: www.bnb.by

**3. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций**

Денежные средства от открытой продажи облигаций Банка четвертого выпуска будут поступать на соответствующие балансовые счета 4940, открытые в Банке.

**4. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

Годовой отчет Банка с аудиторским заключением в составе, определенном законодательством, публикуется в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

Кроме того, в газете «Звязда» публикуется следующая информация:
- о принятом решении о реорганизации или ликвидации Банка – в течение 2 месяцев с момента принятия такого решения;
- о возбуждении в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;
- о внесенных изменениях в Проспект эмиссии – в срок не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента**

Депозитарием Эмитента в соответствии с Договором на депозитарное обслуживание эмитента № 03/1 от 01.04.2004 является депозитарий РУП «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг» (код депозитария – C01, зарегистрирован Минским горисполкомом 18.08.2000 за № 931). Место нахождения: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 2. Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-4-1111, выданное Министерством финансов Республики Беларусь, сроком действия до 29.07.2022.

**6. Размер уставного фонда эмитента**

Уставный фонд Банка составляет 110 751 584 160 (Сто десять миллиардов семьсот пятьдесят один миллион пятьсот восемьдесят четыре тысячи сто шестьдесят) белорусских рублей.

**7. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**

С проспектом эмиссии облигаций четвертого выпуска Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк» можно ознакомиться в период открытой продажи Облигаций на сайте Банка по адресу: www.bnb.by. С копией указанного Проспекта можно ознакомиться в головном офисе Банка ежедневно в рабочие дни (кроме субботы и воскресенья) с 9.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 87а.

**Раздел 2**
**СВЕДЕНИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖИ ОБЛИГАЦИЙ**

**8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о четвертом выпуске Облигаций Банка в соответствии с подпунктом 10.2.18 Устава Банка принято Советом директоров Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк» 10.12.2015 № 40.

**9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций**

Банк осуществляет эмиссию именных бездокументарных, процентных, неконвертируемых Облигаций четвертого выпуска (в дальнейшем именуемых совокупно «Облигации»):

| № вып. | Объем эмиссии по номинальной стоимости, евро | Количество облигаций, штук | Серия, номера облигаций | Номинальная стоимость облигации, евро |
|---|---|---|---|---|
| 4 | 5.000.000 | 100 | BE 4, 000001 – 000100 | 50.000 |

**10. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций**

Выпуск Облигаций осуществляется в целях диверсификации ресурсной базы Банка за счет привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – резидентов и нерезидентов Республики Беларусь. Средства, полученные от размещения Облигаций, будут направлены на пополнение ресурсной базы Банка, финансирование текущих операций банка.

**11. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Облигации выпускаются в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» в пределах 80 процентов нормативного капитала Банка по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь.

**12. Период проведения открытой продажи облигаций**

После опубликования в газете «Звязда» Краткой информации об открытой продаже Облигаций Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк» четвертого выпуска, заверенной в установленном порядке Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (в дальнейшем именуемый «Регистрирующий орган»), Банк проводит открытую продажу Облигаций с 04.01.2016 по 04.07.2016, если иной срок до окончания открытой продажи Облигаций не будет определен Правлением и Советом директоров Банка. Открытая продажа Облигаций прекращается в случае полной реализации всего объема эмиссии Облигаций.

**13. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Открытая продажа (размещение) Облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке и/или в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (г. Минск, ул. Сурганова, 48а) в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Покупателями Облигаций на первичном рынке могут быть юридические лица и индивидуальные предприниматели – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь.

Оплата Облигаций при их покупке осуществляется в валюте номинала в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Для приобретения Облигаций юридические лица (индивидуальные предприниматели) могут обращаться в головной офис Банка ежедневно в рабочие дни (кроме субботы и воскресенья) с 9.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 87а.

Юридические лица (индивидуальные предприниматели), изъявившие желание приобрести Облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке в соответствии с договором купли-продажи (первичного размещения) Облигаций.

Расчеты при открытой продаже Облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Нерезиденты Республики Беларусь могут приобретать Облигации в соответствии с требованиями действующего законодательства Республики Беларусь.

В дату начала открытой продажи Облигаций и в даты выплаты процентного дохода Облигации продаются по номинальной стоимости. В последующие дни Облигации продаются по текущей стоимости.

Текущая стоимость Облигации рассчитывается на дату совершения операции по формуле: $С = Н_п + Д_н$,
где: С – текущая стоимость Облигации;
$Н_п$ – номинальная стоимость Облигации соответствующего выпуска;
$Д_н$ – накопленный процентный доход.

Накопленный процентный доход ($Д_н$) рассчитывается по формуле:

$$Д_н = \frac{Н_п \times П_п}{100} \times \left(\frac{T_{365}}{365} + \frac{T_{366}}{366}\right),$$

где $Д_н$ – накопленный процентный доход;
$Н_п$ – номинальная стоимость Облигации соответствующего выпуска;
$П_п$ – ставка процентного дохода, равная 6,5 (Шесть целых пять десятых) процентов годовых;
T – период начисления процентного дохода (дней), определяемый с даты начала размещения (с даты выплаты процентного дохода, предшествующего расчету текущей стоимости) по дату расчета текущей стоимости;
$T_{365}$ – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
$T_{366}$ – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

День начала размещения Облигации или дата выплаты процентного дохода, предшествующая дню расчета текущей стоимости Облигации, считается одним днем. При этом за дату выплаты процентного дохода принимается дата, установленная в пункте 17 настоящего документа.

Расчет осуществляется по каждой Облигации исходя из фактического количества дней в году, с округлением второго знака после запятой в соответствии с правилами математического округления.

**14. Срок обращения облигаций. Порядок обращения облигаций**

Срок обращения Облигаций – 731 (Семьсот тридцать один) календарный день (с 04.01.2016 по 04.01.2018). День начала размещения и день начала погашения Облигаций считаются одним днем.

Сделки с Облигациями прекращаются за 5 (Пять) рабочих дней до даты выплаты процентного дохода за каждый период начисления процентного дохода в течение срока обращения Облигаций, а также за 5 (Пять) рабочих дней до даты начала их погашения.

Обращение Облигаций осуществляется среди юридических лиц (индивидуальных предпринимателей) в установленном законодательством Республики Беларусь порядке на внебиржевом рынке и (или) через торговую систему на ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» после прохождения совокупности процедур по включению Облигаций в котировальный лист ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

**15. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты**

По Облигациям устанавливается постоянный процентный доход (в дальнейшем именуемый «доход») в виде фиксированного процента к номинальной стоимости Облигации, выплачиваемый владельцам Облигаций периодически в соответствии с графиком, указанным в пункте 17 настоящего документа, в течение срока обращения Облигаций. Ставка дохода устанавливается в размере 6,5 (Шесть целых пять десятых) процентов годовых.

Доход выплачивается:
- на основании реестра владельцев Облигаций, сформированного депозитарием эмитента за 5 (Пять) рабочих дней до даты выплаты дохода (даты формирования реестра указаны в пункте 17 настоящего документа);
- путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь суммы дохода в валюте номинала Облигации на счета владельцев Облигаций, являющихся таковыми по состоянию на дату формирования реестра владельцев Облигаций.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах владельцев Облигаций в валюте номинала настоящего выпуска Облигаций, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, депонируется на счете Банка и выплачивается после письменного обращения владельца Облигации, содержащего актуальные банковские реквизиты. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

Величина дохода по Облигации рассчитывается по формуле:

$$Д = \frac{Н_п \times П_п}{100} \times \left(\frac{T_{365}}{365} + \frac{T_{366}}{366}\right),$$

где Д – доход по Облигации;
$Н_п$ – номинальная стоимость Облигации;
$П_п$ – ставка процентного дохода, равная 6,5 (Шесть целых пять десятых) процентов годовых;
$T_{365}$ – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
$T_{366}$ – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Расчет осуществляется по каждой Облигации исходя из фактического количества дней в году, с округлением второго знака после запятой в соответствии с правилами математического округления.

**16. Период начисления процентного дохода по облигациям**

Период начисления дохода по Облигации – с даты, следующей за датой начала размещения (05.01.2016), по дату начала погашения Облигации включительно.

Доход за первый период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения, по дату его выплаты включительно. Доход по остальным периодам, включая последний, начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода, по дату выплаты дохода за соответствующий период (в последнем периоде – по дату начала погашения) включительно.

**17. Даты выплаты периодически выплачиваемого процентного дохода. Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода**

Доход по Облигации четвертого выпуска выплачивается в дату окончания соответствующего периода начисления дохода:

| ПЕРИОД НАЧИСЛЕНИЯ ДОХОДА | | | | Дата формирования реестра для целей выплаты процентного дохода (погашения) |
|---|---|---|---|---|
| номер периода | начало периода | конец периода, дата выплаты дохода | продолжительность периода, дней | |
| 1 | 05.01.2016 | 05.04.2016 | 92 | 29.03.2016 |
| 2 | 06.04.2016 | 05.07.2016 | 91 | 28.06.2016 |
| 3 | 06.07.2016 | 04.10.2016 | 91 | 27.09.2016 |
| 4 | 05.10.2016 | 04.01.2017 | 92 | 27.12.2016 |
| 5 | 05.01.2017 | 06.04.2017 | 92 | 30.03.2017 |
| 6 | 07.04.2017 | 05.07.2017 | 90 | 28.06.2017 |
| 7 | 06.07.2017 | 04.10.2017 | 91 | 27.09.2017 |
| 8 | 05.10.2017 | 04.01.2018 | 92 | 27.12.2017 |
| ИТОГО | | | 731 | |

В случае если дата выплаты дохода попадает на нерабочий день, фактическая выплата дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму дохода по Облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями понимаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни:
- установленные и объявленные Президентом Республики Беларусь нерабочими днями – в случае перечисления дохода на счета владельцев Облигаций, открытые в банках Республики Беларусь;
- установленные в ином государстве – в случае перечисления дохода через банк-корреспондент, зарегистрированный в ином государстве.

**18. Условия и порядок досрочного погашения облигаций**

Банк может принять решение о досрочном погашении Облигаций четвертого выпуска либо его части в следующих случаях:

18.1. Принятия соответствующего решения Правлением и Советом директоров Банка. О данном решении Банк письменно уведомляет владельцев Облигаций настоящего выпуска не позднее 5 (пяти) рабочих дней до установленной даты досрочного погашения Облигаций.

При досрочном погашении владельцам Облигаций выплачивается их номинальная стоимость, а также доход, рассчитанный с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату досрочного погашения включительно.

Досрочное погашение Облигаций осуществляется Банком:
- в отношении лиц, указанных в реестре владельцев настоящего выпуска Облигаций, который формируется депозитарием Эмитента за 5 (Пять) рабочих дней до установленной Банком даты досрочного погашения Облигаций;
- путем перечисления в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь причитающихся денежных средств в валюте номинала настоящего выпуска Облигаций Банка на счета их владельцев.

Обязательства Банка по досрочному погашению Облигаций считаются полностью исполненными с момента списания денежных средств со счета Банка по реквизитам счетов владельцев Облигаций.

Владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод досрочно погашаемых Облигаций на счет «депо» Банка не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для погашения Облигаций.

Реквизиты для перевода Облигаций:
получатель – ОАО «БНБ-Банк», депозитарий – РУП «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг». Номер счета «депо» – 6000003; раздел счета «депо» – 21; основание перевода – «Перевод ценных бумаг на счет «депо» эмитента в связи с их досрочным погашением».

18.2. Приобретения Банком всего объема четвертого выпуска Облигаций Банка либо его части в порядке, определенном пунктом 21 настоящего документа.

После досрочного погашения Облигаций (принятия решения об аннулировании Облигаций) Банк в установленном порядке уведомляет Регистрирующий орган о необходимости исключения из Государственного реестра ценных бумаг (аннулирования) Облигаций настоящего выпуска или его части.

**19. Порядок погашения облигаций. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций**

Дата начала погашения Облигаций – 04.01.2018.

Дата окончания погашения Облигаций совпадает с датой начала погашения Облигаций.

При погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается номинальная стоимость Облигаций, процентный доход за последний процентный период и иные неполученные выплаты за иные процентные периоды (при наличии таковых).

Погашение Облигаций производится на основании реестра владельцев Облигаций, который формируется за 5 (Пять) рабочих дней до даты начала их погашения. Дата формирования реестра владельцев Облигаций для целей погашения – 27.12.2017.

Перечисление денежных средств на счета владельцев Облигаций при погашении Облигаций осуществляется в валюте номинала в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах владельцев, а также в случаях, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на отдельном счете Банка до письменного обращения владельца Облигаций, при этом проценты по депонированным суммам не начисляются.

Если дата начала погашения Облигаций приходится на выходной (нерабочий) день, перечисление денежных средств при погашении Облигаций осуществляется не позднее рабочего дня, следующего за выходным (нерабочим) днем, при этом проценты на сумму погашения за указанный выходной (нерабочий) день не начисляются.

Обязательства Банка по погашению Облигаций считаются полностью исполненными с момента списания денежных средств со счета Банка по реквизитам счетов владельцев Облигаций.

Владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод погашаемых Облигаций на счет «депо» Банка не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для погашения Облигаций.

Реквизиты для перевода Облигаций:
получатель – ОАО «БНБ-Банк», депозитарий – РУП «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг». Номер счета «депо» – 6000003; раздел счета «депо» – 21; основание перевода – «Перевод ценных бумаг на счет «депо» эмитента в связи с их погашением».

**20. Информация о порядке конвертации облигаций данного выпуска в облигации другого выпуска с более поздней датой погашения**

Банком не предусматривается конвертация Облигаций в облигации других выпусков с более поздней датой погашения.

**21. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения**

В период обращения Облигаций Банк вправе до даты начала погашения Облигаций осуществлять приобретение Облигаций у любого их владельца одновременно с выплатой начисленного процентного дохода за истекшие процентные периоды в следующие даты: 05.04.2016, 05.07.2016, 04.10.2016, 04.01.2017, 06.04.2017, 05.07.2017, 04.10.2017.

Приобретение Облигаций Банком осуществляется в указанные выше даты по цене, равной номинальной стоимости Облигации.

Приобретение Облигаций осуществляется через торговую систему на ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» и (или) на внебиржевом рынке, в местах продажи Облигаций, с заключением соответствующего договора.

Для рассмотрения вопроса о приобретения Облигаций Банком до даты начала их погашения владелец Облигаций должен представить в Банк заявление, которое должно содержать:
- наименование владельца Облигаций (заявителя);
- наименование ценной бумаги;
- количество Облигаций, заявленных к продаже;
- место нахождения и контактные телефоны владельца Облигаций;
- учетный номер плательщика;
- банковские реквизиты для зачисления денежных средств;
- согласие с настоящими условиями приобретения Облигаций Банком;
- подпись уполномоченного лица и печать владельца Облигаций.

Заявление должно быть представлено в Банк (по месту приобретения Облигаций) не позднее, чем за 5 (Пять) рабочих дней до установленной даты их приобретения Банком.

Банк в случае принятия положительного решения, в соответствии с полученным заявлением владельца Облигаций, заключает с владельцем Облигаций договор купли-продажи для осуществления приобретения Облигаций на внебиржевом рынке, или совершает все необходимые действия для заключения сделки купли-продажи в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с законодательством Республики Беларусь (если продажа Облигаций владельцем осуществляется на биржевом рынке).

В период обращения Облигаций Банк имеет право осуществлять:
- приобретение Облигаций Банка по цене, определяемой Банком, на внебиржевом или биржевом рынках в иные сроки (сроки, отличные от дат приобретения, объявленных в данном пункте документа), с учетом порядка обращения Облигаций, установленного пунктом 14 настоящего документа;
- дальнейшую реализацию приобретенных Облигаций Банка по цене, определяемой Банком;
- иные действия с приобретенными Облигациями Банка в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**22. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций регистрирующим органом**

В случае запрещения Регистрирующим органом четвертого выпуска Облигаций, Банк:
- возвращает инвесторам средства, полученные в оплату размещенных Облигаций, а также накопленный по этим Облигациям доход в месячный срок с момента получения уведомления о запрещении выпуска;
- письменно уведомляет Регистрирующий орган о возврате указанных средств инвесторам в полном объеме.

**23. Дата и номер государственной регистрации облигаций**

Облигации зарегистрированы Регистрирующим органом 28.12.2015.
Номер государственной регистрации облигаций: 5-200-02-2696.

Генеральный директор
Открытого акционерного общества
«Белорусский народный банк» К. Церетели

Главный бухгалтер
Открытого акционерного общества
«Белорусский народный банк» Н.П. Шнип

**Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»**
Лицензия №10 на осуществление банковской деятельности
выдана Национальным банком Республики Беларусь 07 июня 2013 г. УНП 100513485.

■ Эксклюзіў

## Леанід КРУПЕЦ:

# «БРАЗІЛЬСКІ ВЕКТАР СУПРАЦОЎНІЦТВА ВЕЛЬМІ ВАЖНЫ ДЛЯ БЕЛАРУСІ»

**Супрацоўніцтва з Бразіліяй для нашай краіны насамрэч з'яўляецца стратэгічным. Гэта вельмі важны напрамак узаемадзеяння, пляцоўка для замацавання і далейшага прасоўвання ў Лацінскай Амерыцы. Да таго ж не варта забывацца, што бразільская эканоміка ўваходзіць у лік вядучых у свеце. Наколькі мы змаглі наладзіць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, вывесці яго на ўзровень стратэгічнага партнёрства, якія тут перспектывы? Аб гэтым у эксклюзіўным інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды» распавёў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Бразілія Леанід КРУПЕЦ.**



***— Сёлета падчас самітаў БРІКС і ШОС Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з Прэзідэнтам Бразіліі Дзілмай Русеф. Кіраўнікі краін дамовіліся, што будуць вызначаны 4-5 ключавых праектаў, якія бакі пачнуць рэалізоўваць і якія стануць прыкладам для развіцця адносін. Што гэта за праекты і якім чынам праходзіць іх рэалізацыя?***

— Падчас гэтай сустрэчы была дасягнута дамоўленасць аб стварэнні міжурадавай камісіі з мэтай вывучэння бягучага стану двухбаковых адносін і перспектыў пашырэння супрацоўніцтва. Зараз бакі распрацоўваюць юрыдычны механізм узаемадзеяння, вызначаюць канкрэтныя напрамкі працы, якія ўяўляюць узаемны інтарэс.

Варта адзначыць, што Бразілія з'яўляецца адным з найбуйнейшых у свеце вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Урад краіны паставіў перад сабой задачу павелічэння яе вытворчасці ўдвая цягам найбліжэйшых 10-15 гадоў. Маючы на ўвазе перспектыўнасць бразільскага рынку сельгастэхнікі, пасольства апошнія некалькі гадоў сумесна з адкрытымі акцыянернымі таварыствамі «Мінскі трактарны завод», «БелАЗ», «Гомсельмаш» і бразільскімі партнёрамі прапрацоўвае магчымасць стварэння ў гэтай краіне зборачнай вытворчасці беларускай тэхнікі. Мы разумеем, што яе прасоўванне на гэты рынак — няпростая задача. Тут высокі ўзровень канкурэнцыі, паколькі Бразілія з'яўляецца найбуйнейшым цэнтрам Лацінскай Амерыкі па вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі (кампаніі «Agrale», «Case CNN», «John Deer», «Massey Fergusson», «New Holland», «Valtra»). Таксама неабходна шукаць інвестара, які гатовы фінансаваць праект.

Зараз наладжваецца супрацоўніцтва паміж Мінскім заводам грамадзянскай авіяцыі №407 і бразільскай авіябудаўнічай кампаніяй «Эмбраэр». У рамках гэтага праекта вывучаецца магчымасць тэхнічнага абслугоўвання самалётаў «Эмбраэр» на тэрыторыі Беларусі. У пачатку студзеня ў горадзе Сан-Паўлу прайшлі перамовы па гэтым пытанні. Таксама прапрацоўваецца магчымасць стварэння ў Бразіліі сумеснага прадпрыемства па выпуску змяшаных угнаенняў.

***— Беларускім лідарам пастаўлена задача: выйсці на ўзровень паставак на рынкі Лацінскай Амерыкі ў 5 мільярдаў долараў, прычым пятая частка гэтага паказчыка забяспечваецца за кошт Бразіліі. Якая дынаміка беларускага экспарту ў гэтую краіну?***

— Сёлета бразільская эканоміка перажывае крызіс, у выніку закупкі гэтай краінай па імпарце ўпалі на 23,1%. Гэта, у сваю чаргу, адбілася і на аб'ёмах беларускага экспарту ў Бразілію: за 10 месяцаў бягучага года адпаведны паказчык скараціўся ў параўнанні з такім жа часам летась на 26,8% і склаў 488,4 мільёна долараў. У асноўным скарачэнне экспарту адбылося з прычыны значнага змяншэння аб'ёмаў продажу калійных угнаенняў (мінус 27,3%, ці на $178,7 млн), спынення паставак сельскагаспадарчай тэхнікі, вылічальных машын для аўтаматычнай апрацоўкі інфармацыі, шэрагу іншых таварных пазіцый.

Разам з тым Бразілія застаецца асноўным гандлёвым партнёрам Беларусі ў Лацінскай Амерыцы, паколькі на яе долю прыпадае 83,7% нашага экспарту ў гэты рэгіён. Аснову беларускага экспарту сёлета складаюць пастаўкі калійных і азотных угнаенняў (475,7 млн і 11,2 млн долараў адпаведна), а таксама рэнтгенаўскай апаратуры, ільняных тканін, поліамідаў, шкловалакна, апаратуры для вымярэння і кантролю электрычных велічынь і выпраменьванняў, шын. Варта заўважыць, што рэзервы ў прасоўванні беларускай прадукцыі на бразільскі рынак (трэба мець на ўвазе яго аб'ём і маштабы) далёка не вычарпаны.

***— Леанід Фёдаравіч, што робіцца ў плане стварэння сумесных прадпрыемстваў, у тым ліку зборачных вытворчасцяў?***

— Гэтаму пытанню пасольства надае сур'ёзную ўвагу. Паспяховая рэалізацыя ў Бразіліі такога маштабнага праекта, як арганізацыя зборачнай вытворчасці трактароў «Беларус», можа ў перспектыве стварыць спрыяльныя перадумовы для ўвасаблення іншых праектаў у галіне машынабудавання. Напрыклад, у гэтай краіне развіта горназдабываючая галіна, таму, як мы лічым, кар'ерная тэхніка вытворчасці холдынга «БелАЗ» была б запатрабавана на бразільскім рынку.

Аснову эканамічнага росту Бразіліі на сучасным этапе фарміруе сельская гаспадарка. Таму перспектыўны кірунак — магчымае стварэнне зборачнай вытворчасці кормаўборачнай тэхнікі прадпрыемства «Гомсельмаш», а таксама маламагутнай трактарнай тэхнікі для прыватных фермерскіх гаспадарак, якую выпускае Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў. Гэтыя прадпрыемствы ўважліва вывучаюць адпаведныя напрамкі супрацоўніцтва.

***— Асобны пункт — пастаўкі калійных угнаенняў. Бразілія, разам з Кітаем і Індыяй, з'яўляецца найбуйнейшым імпарцёрам гэтай прадукцыі з Беларусі. Як тут развіваецца сітуацыя?***

— Бразілія — аграрная краіна, тут збіраюць да трох ураджаяў у год. Прычым для яе характэрны глебы, якія не адрозніваюцца высокай ураджайнасцю. У сувязі з гэтым аграрны сектар краіны мае вялікую патрэбу ў розных відах угнаенняў. Адкрытае акцыянернае таварыства «Беларуская калійная кампанія» з'яўляецца адным з асноўных пастаўшчыкоў хлорыстага калію на бразільскі рынак. Толькі летась сюды было адгружана 2,3 мільёна тон на 695 мільёнаў долараў. Сёлета, як ужо адзначалася, адбылося пэўнае змяншэнне паставак. Беларуская калійная кампанія плануе адкрыць у Сан-Паўлу ўласнае прадстаўніцтва. Прасочваецца стабільная дынаміка экспарту азотных угнаенняў. Сёлета іх пастаўлена 91 тысяча тон.

***— А што за прадукцыя трапляе да нас з Бразіліі?***

— Цягам шэрагу гадоў беларускі імпарт з Бразіліі значна саступае нашаму экспарту ў паўднёваамерыканскую краіну. Пры гэтым мы імпартуем прадукцыю, найперш сельскагаспадарчую, якую немагчыма вырасціць у беларускіх кліматычных умовах. Гэта трапічная садавіна, гародніна, сокі, экстракты, кава, матэ. Пастаўляюцца таксама цукар-сырэц, тытунёвая сыравіна, фарбавальныя рэчывы, скура, абутак, абсталяванне, прыборы, апараты і многае іншае.

***— Леанід Фёдаравіч, якім чынам ажыццяўляецца абмен вопытам у розных сферах сацыяльна-эканамічнага развіцця і глабальнага ўзаемадзеяння Беларусі і дзяржаў БРІКС на прыкладзе Бразіліі?***

— З усіх краін — членаў БРІКС Бразілія геаграфічна самая аддаленая ад Беларусі, таму аб глабальным узаемадзеянні тут казаць, напэўна, заўчасна. З іншага боку, варта мець на ўвазе тое, што арганізацыя рухаецца па шляху ўмацавання інстытуцыянальных асноў і яе роля ў міжнародных справах паступова будзе павялічвацца. Цяпер у БРІКС створана мноства фарматаў супрацоўніцтва, развіццё па якіх адбываецца з рознай ступенню інтэнсіўнасці. Трэба ўзважана падыходзіць да таго, які з гэтых фарматаў найбольш прымальны для Беларусі.

**Інтарэс да Беларусі з боку бразільцаў павялічваецца. Мы актыўна прапагандуем у мясцовых СМІ і сацыяльных сетках нашу цудоўную краіну, яе культуру і традыцыі, нацыянальную кухню і турыстычныя аб'екты. І гэтая работа прыносіць свой плён.**

Асобна варта адзначыць, што ў БРІКС у стадыі фарміравання знаходзіцца працэс палітычнай кансалідацыі. Дзяржавы блока прытрымліваюцца адзінай пазіцыі ў рамках такіх міжнародных арганізацый, як G-20, Міжнародны валютны фонд, Сусветная гандлёвая арганізацыя. У практычнай плоскасці, з улікам узрастаючага ўзроўню палітычнага ўзаемадзеяння Беларусі з краінамі БРІКС, праглядаюцца рэальныя перспектывы яго задзейнічання пры адстойванні нашых пазіцый на міжнароднай арэне, напрыклад у ААН.

Умацаванне БРІКС у інтарэсах Беларусі з пункту погляду фарміравання шматпалярнага сусветнага парадку. Прынятыя на саміце ў Бразіліі ў чэрвені 2014 года, а таксама ва Уфе ў ліпені 2015-га рашэнні аб стварэнні Новага банка развіцця і Пула ўмоўных валютных рэзерваў маюць важнае значэнне для далейшага ўмацавання арганізацыі ў сусветнай фінансава-эканамічнай сістэме.

Дарэчы, у рэалізацыі праграм, якія ажыццяўляюцца пры фінансаванні Новага банка развіцця і Пула ўмоўных валютных рэзерваў, магчымы ўдзел кампаній з трэціх краін пры ўмове далучэння да праекта дзвюх і больш дзяржаў БРІКС. Найбольш перспектыўным варыянтам арганізацыі работы ў дадзеным кірунку з'яўляецца прыцягненне бразільскіх рэзідэнтаў у Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» для стварэння сумесных прадпрыемстваў, якія плануюць рэалізоўваць сваю прадукцыю на рынку краін — членаў ЕАЭС.

БРІКС у сучасных умовах становіцца адной з вядучых пляцовак для перамоў, якія дазваляюць адкрыта абмяркоўваць пытанні, якія цікавяць бакі. У прыватнасці, мы ўжо ўзгадвалі сустрэчу прэзідэнтаў Беларусі і Бразіліі сёлета ва Уфе, падчас якой бакі абмеркавалі шырокі спектр пытанняў, што датычацца супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і іншых сферах.

Тут неабходна адзначыць і актывізацыю ўзаемадзеяння нашых краін у галіне адукацыі. Паміж галіновымі міністэрствамі Беларусі і Бразіліі сёлета ў жніўні заключана пагадненне аб супрацоўніцтве. Такія ж дакументы падпісаны паміж шэрагам універсітэтаў абедзвюх краін. Мы працуем па актывізацыі супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні паміж штатамі Бразіліі і абласцямі Беларусі. Трывалыя кантакты падтрымліваюцца на ўзроўні парламенцкіх груп. Так, дэлегацыя на чале з віцэ-прэзідэнтам Палаты прадстаўнікоў Бразіліі Фернанду Лусіу Жыакобу сёлета восенню наведала Беларусь.

***— Налета Бразілія прымае летнія Алімпійскія гульні. Як праходзіць падрыхтоўка да іх правядзення ў плане ўдзелу беларускай дэлегацыі і магчымасцяў для прыезду балельшчыкаў?***

— Першая летняя Алімпіяда ў Лацінскай Амерыцы — гэта вялікае дасягненне не толькі для Бразіліі, а і для ўсяго кантынента. Урад і насельніцтва краіны актыўна рыхтуюцца да яе правядзення. Вядомы беларусам шмат у чым дзякуючы творчасці Ільфа і Пятрова горад Рыа-дэ-Жанейра абяцае стаць найлепшым і найпрыгажэйшым. Беларуская спартыўная дэлегацыя возьме ўдзел у Алімпіядзе ў Бразіліі. Над атрыманнем пуцёвак цяпер старанна працуюць нашы спартсмены.

Балельшчыкам бразільцы ствараюць самыя спрыяльныя ўмовы. Для іншаземцаў, якія збіраюцца прыехаць у краіну падчас правядзення Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў 2016 года, у адпаведнасці са спецыяльным законапраектам прадугледжана бязвізавае наведванне не пазней за 18 верасня тэрмінам да 90 дзён.

***— Вельмі важны культурны абмен паміж нашымі краінамі. Наколькі паспяхова ён ажыццяўляецца?***

— Нягледзячы на значную адлегласць паміж нашымі краінамі, супрацоўніцтва ў гуманітарнай і культурнай сферах актыўна развіваецца. Толькі за апошні год беларускае пасольства наладзіла ў Бразіліі выставу паштовых марак, арганізавала дзве выставы рэпрадукцый карцін вядомага беларускага мастака Івана Хруцкага ў горадзе Гаяніі і сталіцы краіны горадзе Бразілія. На выставах таксама былі прадстаўлены традыцыйныя беларускія нацыянальныя строі.

Папулярызацыі нашай культуры садзейнічалі арганізаваныя пасольствам паказы на бразільскім тэлеканале «TV Supren» серыі канцэртаў Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь. Пры падтрымцы пасольства сёлета ў ліпені бразільскі тэнар Цьяга Аранкам узяў удзел у XXIV Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў якасці члена журы, а таксама выступіў у гала-канцэрце. У мінулым месяцы дакументальны фільм бразільскага рэжысёра Вальтэра Салеса «Цзя Чжанкэ, хлопец з Фэньян» удзельнічаў у пазаконкурсным паказе XXII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Не забываемся і пра моладзь Бразіліі. У верасні гэтага года мы ўдзельнічалі ў сацыяльным праекце ўрада горада Бразілія «Пасольствы адчыненых дзвярэй». Беларускае дыппрадстаўніцтва наведала група навучэнцаў восьмых класаў горада Ітапуа Федэральнай акругі Бразілія.

Я рэгулярна сустракаюся са студэнтамі і аспірантамі вышэйшых навучальных устаноў Бразіліі — ва ўніверсітэтах Федэральнай акругі, штатаў Сеара, Парана, Рарайма, Амазонас, Рыа-Грандзі-ду-Сул. Гэта цудоўная пляцоўка для ўмацавання нашых двухбаковых адносін ва ўсіх сферах.

Пасольствам быў праведзены шэраг сустрэч, прысвечаных значным датам у беларускай гісторыі. Напрыклад, сёлета ў красавіку на бразільскім тэлебачанні прайшоў круглы стол з удзелам акрэдытаваных у Бразіліі паслоў Арменіі, Беларусі, Казахстана і Расіі, прымеркаваны да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Як бачым, наша гуманітарнае супрацоўніцтва актыўна развіваецца. І налета пасольства рыхтуе некалькі адметных праектаў, якія прадставяць бразільцам беларускую самабытную культуру.

***— Якія перспектывы росту колькасці турыстаў, якія наведваюць Бразілію і Беларусь, павелічэння даступнасці нашых краін?***

— Адметная статыстыка: 70 працэнтаў бразільцаў аддаюць перавагу адпачынку ў сваёй краіне — прыкладна 62 мільёны чалавек. Для гэтага тут створана і пастаянна ўдасканальваецца адпаведная турыстычная інфраструктура, ёсць усе ўмовы для пляжнага і актыўнага баўлення вольнага часу. Бразільскія турысты ў асноўным накіроўваюцца ў краіны Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі, Еўропы. Пакуль што амаль нязведанай тэрыторыяй для іх застаюцца дзяржавы постсавецкай прасторы. Летась у Расію з Бразіліі прыехала 31 тысяча турыстаў. Беларусь наведала значна меншая колькасць. Між тым варта зазначыць, што Бразілія робіць сур'ёзную стаўку на развіццё турызму. У 2014 годзе гэтую краіну наведалі 6,42 мільёна замежных турыстаў. У гэтай сферы занята 8,8 млн чалавек. Бразілія з'яўляецца 9-й турыстычнай эканомікай свету, штогод зарабляе на турызме да 10 працэнтаў ВУП.

Калі ацэньваць перспектывы развіцця турыстычных стасункаў паміж нашымі краінамі, варта ўлічваць значную адлегласць і, адпаведна, цэнавы фактар (толькі адзін пералёт з Мінска каштуе каля 2 тысяч долараў). Зразумела, гэты напрамак не стане масавым. Разам з тым, мы актыўна імкнёмся да таго, каб пазбавіцца ад пэўных адміністрацыйных перашкод не толькі для турыстаў, але і для бізнесменаў. Сёлета ў ліпені Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам было прынята рашэнне аб заключэнні беларуска-бразільскага пагаднення аб адмене віз для кароткатэрміновых паездак шляхам абмену нотамі. Гэта адказ на адпаведную прапанову МЗС Бразіліі. Уступленне ў дзеянне гэтага пагаднення будзе садзейнічаць ліквідацыі візавых бар'ераў для арганізацыі паездак беларускіх дэлегацый, а таксама беларускіх і бразільскіх грамадзян, прадстаўнікоў дзелавых колаў у нашы краіны.

Увогуле, апошнім часам інтарэс да Беларусі з боку бразільцаў павялічваецца. Мы актыўна прапагандуем у мясцовых СМІ і сацыяльных сетках нашу цудоўную краіну, яе культуру і традыцыі, нацыянальную кухню і турыстычныя аб'екты. І гэтая работа прыносіць свой плён.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.** *litvinov@zviazda.by*

---

## Извещение о проведении 28 января 2016 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества) | Изолированное помещение (административное помещение), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Нововиленская, 38, помещение 6, общей площадью 18,3 м² (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/D-708025125; наименование: административное; назначение: административное помещение) |
| Местонахождение имущества | г. Минск, ул. Нововиленская, 38, помещение 6 |
| Начальная цена | 262 288 800 рублей |
| Сумма задатка | 26 200 000 рублей |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |
| Балансодержатель (должник) | БП СП ООО «Бокемин» |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Аукцион проводится **28 января 2016 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 12.01.2016 по 26.01.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

---

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
**ЗАВЕРЕНА**
________________С.А. Сушко
29.12.2015 г.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ВОСЕМЬДЕСЯТ ЧЕТВЕРТОГО ВЫПУСКА

СОВМЕСТНОГО ОБЩЕСТВА С ОГРАНИЧЕННОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТЬЮ «ТАМБАЗ» СООО «ТАМБАЗ» (СУМЕСНАГА ТАВАРЫСТВА З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ «ТАМБАЗ» СТАА «ТАМБАЗ»)

1. Полное наименование эмитента:
на русском языке – совместное общество с ограниченной ответственностью «ТАМБАЗ»; на белорусском языке – сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ТАМБАЗ». Сокращенное наименование эмитента:
на русском языке – СООО «ТАМБАЗ»;
на белорусском языке – СТАА «ТАМБАЗ».

2. Решением Минского горисполкома № 42 от 13 января 2005 года Эмитент был зарегистрирован в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100348810.

3. Место нахождения Эмитента:
Республика Беларусь, 220073, г. Минск, пр. Пушкина, 68, комн. 33.
Тел.: 8(017) 220 77 80. E-mail: tambaz@yandex.ru

4. Основными видами деятельности Эмитента являются организация и обеспечение строительства жилых домов, выполнение функций заказчика-застройщика с обеспечением технического надзора за ходом строительства, сдача в аренду машин, оборудования.

5. Размер уставного фонда Эмитента составляет 103 000 (сто три тысячи) долларов США.

6. Общий объем 84 выпуска жилищных облигаций Эмитента составляет 4 158 000 000 (четыре миллиарда сто пятьдесят восемь миллионов) белорусских рублей. Количество выпускаемых облигаций составляет 630 (шестьсот тридцать) штук. Номинальная стоимость облигации серии ОТ-84 составляет 6 600 000 (шесть миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент равный одному метру квадратному общей площади в квартире в строящемся жилом доме №8 (по генплану) комплекса «Многоэтажных жилых домов (не относящихся к жилым домам повышенной комфортности) со встроенно-пристроенными административными и торговыми помещениями и подземной двухуровневой автостоянкой в квартале ул. М. Богдановича – ул. Корш-Саблина – ул. Тургенева – пер. Верхний» в г. Минске (2-я очередь строительства) без учета стоимости отделочных работ. Дата начала погашения – 31 декабря 2017 года.

7. Период проведения открытой продажи облигаций – с 4 января 2016 года до 31 декабря 2017 года.

Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические, физические лица и индивидуальные предприниматели, заключившие с Эмитентом соглашение в простой письменной форме, предусматривающее обязательства Эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

8. Срок обращения облигаций: с 4 января 2016 года по 31 декабря 2017 года, 727 календарных дней.

9. Исполнение обязательств по облигациям серии ОТ-84 обеспечивается поручительством юридического лица согласно договору поручительства № б/н от «11» декабря 2015 г., заключенного с Обществом с ограниченной ответственностью «Интерфакт», который действует по 31 марта 2018 года. Сумма поручительства, в пределах которой поручитель отвечает перед владельцами облигаций, исполнение обязательств по которым обеспечивается поручительством, в случае неисполнения или ненадлежащего исполнения эмитентом обязательств по облигациям, составляет: 4 158 000 000 (четыре миллиарда сто пятьдесят восемь миллионов) белорусских рублей.

10. Номера счетов Эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций:
- текущий счет № 3012087855016 в ОАО «Белорусский Народный Банк» г. Минска, код 765;
- текущий счет № 3012621670017 в ЗАО «Трастбанк» г. Минск, код 288;
- текущий счет № 3012144770011 в ОАО «Технобанк» г. Минск, код 182.

11. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность Эмитента, информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии, информация о принятом решении о реорганизации Эмитента либо о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) «Экономическая газета» и/или газета «Звязда».

Срок публикации бухгалтерской отчетности: ежегодно не позднее «30» марта.

Срок публикации информации о внесенных изменениях в Проспект эмиссии: не позднее семи календарных дней после регистрации изменений в регистрирующем органе.

Срок публикации информации о принятом решении о реорганизации Эмитента: не позднее пяти рабочих дней после принятия соответствующего решения.

Срок публикации информации о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве): в течение пяти дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Информация о принятом решении о ликвидации (прекращении деятельности) Эмитента публикуется в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в срок не позднее пяти рабочих дней после принятия соответствующего решения.

12. Депозитарное обслуживание жилищных облигаций Эмитента осуществляет депозитарий Эмитента – Республиканское унитарное предприятие «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг».

Юридический адрес депозитария Эмитента: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте 2, 4-й этаж. Почтовый адрес депозитария Эмитента: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 2, 4-й этаж;

Дата и регистрационный номер депозитария Эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа: Мингорисполком, № 100967318 от 06 марта 2003 года;

Номер лицензии Министерства финансов Республики Беларусь № 02200/5200-4-1111 от 16 мая 2012 г., срок действия лицензии – до 29 июля 2022 года.

13. С Проспектом эмиссии жилищных облигаций можно ознакомиться по адресу: 220040, г. Минск, ул. Тургенева, д. 5, пом. 72.

Генеральный директор СООО «Тамбаз» Л. И. Хаютин

Главный бухгалтер Н. Б. Соколовская

---

# АД КАМІТЭТА ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЯХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Аб работах, дапушчаных да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2016 года

У адпаведнасці з пунктам 9 Палажэння аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 г. № 300 «Аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь», з мэтай шырокага азнаямлення грамадскасці, прадстаўляецца інфармацыя аб работах і аўтарскіх калектывах, якія дапушчаны да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2016 года.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі 2016 года дапушчаны наступныя работы і аўтарскія калектывы:

Драган Вячаслаў Ігнацьевіч, Пойта Пётр Сцяпанавіч, Тур Віктар Уладзіміравіч, Шалабыта Мікалай Мікалаевіч, Мухін Анатолій Віктаравіч. Работа «Распрацоўка, даследаванне і шырокае ўкараненне ў практыку будаўніцтва эфектыўнай металічнай структурнай канструкцыі сістэмы «БрДТУ», якая прымяняецца пры ўзвядзенні вялікапралётных, у тым ліку ўнікальных, пакрыццяў збудаванняў». Вылучана ўстановай адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт». Прадстаўлена Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Руммо Алег Алегавіч, Астроўскі Юрый Пятровіч, Дзядзько Аляксандр Міхайлавіч, Калачык Алег Валянцінавіч, Шчэрба Аляксей Яўгеньевіч, Валенцюкевіч Андрэй Валянцінавіч. Работа «Распрацоўка і ўкараненне тэхналогій трансплантацыі органаў у дзяцей і дарослых». Вылучана ўстановай аховы здароўя «9-я гарадская клінічная бальніца». Прадстаўлена Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Грабчыкаў Сяргей Сцяпанавіч, Зайцаў Валерый Аляксандравіч, Кавальчук Генадзій Піліпавіч, Саладуха Віталій Аляксандравіч, Чыжык Сяргей Антонавіч, Шведаў Сяргей Васільевіч. Работа «Распрацоўка і арганізацыя прамысловай вытворчасці экспартна-арыентаваных мікраэлектронных вырабаў двайнога і спецыяльнага прызначэння на аснове стварэння сучасных метадаў праектавання, паўправадніковых тэхналогій і высокадакладнага аналітычнага і зборачнага абсталявання». Вылучана ААТ «ІНТЭГРАЛ» — кіруючая кампанія холдынгу «ІНТЭГРАЛ». Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь; Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Ляўко Вольга Мікалаеўна, Дук Дзяніс Уладзіміравіч. Работа «Вытокі беларускай дзяржаўнасці: Полацкая і Віцебская землі ў IX—XVIII стагоддзях». Вылучана дзяржаўнай навуковай установай «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Пархомчык Пётр Аляксандравіч, Сцяпук Алег Георгіевіч, Трухноў Леанід Іванавіч, Сямёнаў Леанід Віктаравіч, Кашэўскі Яўгеній Пятровіч, Наскавец Аляксандр Міхайлавіч. Работа «Распрацоўка звышцяжкага кар'ернага самазвала БЕЛАЗ-75710 рэкорднай грузападымальнасцю 450 тон». Вылучана ААТ «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынгу «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ». Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Сцяпук Леанід Якаўлевіч, Марыніч Леанід Адамавіч, Лапа Віталій Вітальевіч, Перавознікаў Васілій Мікалаевіч. Работа «Стварэнне і ўкараненне ў сельскагаспадарчую вытворчасць комплексаў машын, якія вызначаюць рэзультатыўнасць земляробства і жывёлагадоўлі Рэспублікі Беларусь». Вылучана РУП «НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Рупасава Жанна Аляксандраўна, Рашэтнікаў Уладзімір Мікалаевіч, Ціток Уладзімір Уладзіміравіч, Паўлоўскі Мікалай Баляслававіч, Якаўлеў Аляксандр Паўлавіч, Лягускі Васілій Рыгоравіч. Цыкл работ «Інтрадукцыя і ўвядзенне ў прамысловую культуру на меліяраваных землях і выбыўшых з прамысловай эксплуатацыі тарфяных месцанараджэннях Беларусі паўночнаамерыканскіх відаў верасовых (журавіны буйнаплодныя, буякі высакарослыя) і сартавых брусніц». Вылучана ДНУ «Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Прывалаў Фёдар Іванавіч, Грыб Станіслаў Іванавіч, Казлоўская Зоя Аркадзьеўна, Кільчэўскі Аляксандр Уладзіміравіч, Кавалевіч Аляксандр Іванавіч «Стварэнне банка генетычных рэсурсаў сельскагаспадарчых і лясных раслін для забеспячэння харчовай і біялагічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь». Вылучана РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Герман Андрэй Аляксандравіч, Кандратчык Валерый Аркадзьевіч, Маскаленка Павел Віктаравіч, Дзмітраковіч Андрэй Аляксандравіч, Вашкевіч Грэнальд Міхайлавіч, Косінаў Яўгеній Сямёнавіч. Работа «Распрацоўка і асваенне вытворчасці сістэмы машын лесапрамысловага комплексу АМКАДОР». Вылучана ААТ «АМКАДОР» — кіруючая кампанія холдынгу». Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры 2016 года дапушчаны наступныя аўтары і творчыя калектывы:

Волкава Аксана Уладзіміраўна, Масквіна Анастасія Ігараўна, Трыфанаў Станіслаў Уладзіміравіч, Франкоўскі Сяргей Уладзіміравіч, Ламановіч Ніна Іосіфаўна, Касцючэнка Аляксандр Аляксандравіч. За значныя творчыя дасягненні ў развіцці музычнага мастацтва, прапаганду духоўных каштоўнасцей і значны асабісты ўклад у пастаноўку опернага спектакля на музыку Дз.Смольскага «Сівая легенда» па творы У.Караткевіча. Вылучаны дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установай «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Крапак Барыс Аляксеевіч. За серыю кніг і альбомаў пра жыццё і творчасць дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі. Вылучаны ГА «Беларускі саюз мастакоў». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Пазнякоў Міхаіл Паўлавіч. За кнігі для дзяцей «У родным краі», «Гульняслоў», «Серабрыстыя чайкі». Вылучаны ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Алай Анатолій Іванавіч. За цыкл дакументальных фільмаў пра Вялікую Айчынную вайну «Яго закапалі ў шар зямны», «Чорная дарога», «Адрынуты», «Салдаты Італіі», «За два крокі ад Гільяціны», «Чырвоны д'ябал», «Пётр Конюх», «Георгій Жукаў. Вайна і мір маршала Перамогі», «Бумеранг». Вылучаны ГА «Беларускі саюз кінематаграфістаў». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Кандрусевіч Уладзімір Пятровіч. За значныя дасягненні ў галіне тэатральнага і музычнага мастацтва, стварэнне музыкі да балета «Мефісто», мюзіклаў «Шклянка вады», «Джулія», «Софія Гальшанская», «Байкер». Вылучаны ўстановай «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр». Прадстаўлена Міністэрствам культуры і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Янкоўскі Расціслаў Іванавіч. За выдатнае ўвасабленне вобразаў класічнай замежнай і сучаснай айчыннай драматургіі ў спектаклях «Сунічная паляна» І.Бергмана, «Праўда — добра, а шчасце лепш» А.Астроўскага, «Пане Каханку» А.Курэйчыка, «Гора ад розуму» А.Грыбаедава. Вылучаны ДУ «Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М.Горкага». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Казінец Міхаіл Антонавіч, Крамко Аляксандр Яўгеньевіч, Сімаковіч Ларыса Іванаўна. За стварэнне канцэртаў-спектакляў тэтралогіі «Святое, незабыўнае...» (музычна-тэатралізаваныя пастаноўкі «Гусляр», «Апокрыф», «Песня пра долю», «Люцыян Таполя»). Вылучаючая арганізацыя: установа «Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія». Вылучаны ўстановай «Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія». Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Буралкін Генадзій Васільевіч, Занковіч Валянцін Паўлавіч, Федчанка Сталін Іванавіч. За стварэнне мемарыялаў і скульптурных груп пагранічнай тэматыкі ў перыяд 2004 — 2011 гг. Вылучаны Дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь. Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, падкамітэт па Дзяржаўных прэміях у галіне навукі і тэхнікі, падкамітэт па Дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры звяртаецца да кіраўнікоў арганізацый, устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў з просьбай прыняць удзел у абмеркаванні пералічаных работ і аўтарскіх калектываў.

Водгукі спецыялістаў, матэрыялы грамадскага абмеркавання, прапановы і заўвагі па работах, аўтарскіх калектывах і аўтарах прымаюцца да 15 верасня 2016 года па адрасе: 220072, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 66, каб. 317, 413, сакратарыят Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

Тэл. (017) 284-11-63; тэл./факс (017) 284-24-56, (017) 284-23-81. УНП 101078490

■ Святкуем разам!

# ГОД БРАЗІЛІІ, АЛІМПІЯДЫ І МАЛПЫ

**Напярэдадні наступлення новага 2016 года, які стане багатым на спартыўныя падзеі, вядомыя айчынныя атлеты распавядаюць пра тое, як будуць сустракаць свята, што гатаваць на стол, і перадаюць свае пажаданні чытачам «Звязды»**

**Гэтае свята — адно з найлюбімейшых у беларусаў, гэта дзень, у які людзі загадваюць жаданні, чакаюць цудаў і абавязкова прытрымліваюцца сямейных традыцый. Спартсмены, графік якіх часам распісаны па хвілінах, не становяцца выключэннем і аддаюць перавагу праводзіць свята ў коле родных і блізкіх. Пра што марылі нашы алімпійскія чэмпіёны, шматразовыя пераможцы буйных спартыўных спаборніцтваў у дзяцінстве і якіх традыцый прытрымліваюцца сёння, напярэдадні Новага года яны распавялі нашаму карэспандэнту.**



***Антаніна КОШАЛЬ (алімпійская чэмпіёнка):***

— У перадкалядны час я заўсёды ўзгадваю сваё дзяцінства. Асабліва тыя моманты, калі мама шыла мне і сёстрам сукенкі, крухмаліла іх, рыхтавала нас да гэтага свята. Дзяўчынак у нашай сям'і было пяцёра, таму падрыхтоўку мы пачыналі за доўга да Новага года, затое былі заўсёды самыя прыгожыя, самыя накрухмаленыя, у каралях. Для мяне ў гэты дзень заўсёды была асаблівая атмасфера, аўра, настрой, мы былі вельмі шчаслівыя.

У гады спартыўнай кар'еры да Новага года сезон у нас быў ужо завершаны, але расслабіцца ўсё роўна не маглі. З'есці салодкае я не мела права, выпіць шампанскага таксама. А сёння на святочным стале ў мяне абавязкова павінна быць салата аліўе з ялавічынай, ні ў якім разе не з каўбасой, селядзец пад футрам, сабраныя сваімі рукамі грыбы і фаршыраваныя яйкі.

Ну, а найлепшым падарункам заўсёды былі смачныя цукеркі, пра такія рэчы, якія заказваюць сёння дзеці, мы і не марылі. Цяпер у мяне падрыхтоўка да Новага года вельмі сур'ёзная: трое ўнукаў, кожны напісаў ліст і чакае падарунак пад ёлку. Сустракаем мы заўсёды гэтае свята з сям'ёй, дзякуй Богу, яна ў нас большае.

Адзначу, што 2016-ты стане для нашых спартсменаў вельмі адказным, таму я хачу пажадаць усім тым, хто яшчэ не заваяваў алімпійскія ліцэнзіі — узяць запаветныя пуцёўкі ў Рыа. Тым, хто будзе змагацца на Алімпійскіх гульнях, вядома, хацелася б пажадаць шанцавання: трэба зрабіць усё магчымае і немагчымае, усё, каб мары спраўдзіліся. Алімпіяда, як заўсёды, праляціць вельмі хутка, трэба ўкласціся, каб памяць пра 2016-ты засталася на ўсё жыццё.



***Наталля ЦЫЛІНСКАЯ (бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў, шматразовая чэмпіёнка свету):***

— Галоўная навагодняя традыцыя для мяне — гэта жывая елка, ніколі нічым яе не заменіш. Таксама неад'емным сімвалам гэтага свята з'яўляюцца мандарыны і бананы, якія ў маім дзяцінстве з'яўляліся выключна перад Новым годам. Як цяпер памятаю: зялёныя бананы ўкручвалі ў коўдру, каб яны хутчэй паспелі. Гэта, бадай, галоўныя ўспаміны. Калі казаць пра падарункі, то ў дзяцінстве я хацела атрымаць усяго і пабольш, адзінае — не вельмі любіла цукеркі.

У гады спартыўнай кар'еры даводзілася сустракаць Новы год не дома, але ў такія моманты ўжо і не адчуваеш свята. А цяпер, калі ў мяне свае дзеці, то традыцыйна мы сустракаем яго ўсёй сям'ёй, упрыгожваем елку, дарэчы, у нас у планах пасадзіць сваё дрэва ў двары, каб яна была круглы год. Па звычцы з дзяцінства на стале ў мяне заўсёды ёсць аліўе, новы звычай пакуль ніхто не ўвёў.

Чытачам «Звязды» напярэдадні навагодніх свят хачу сказаць: давайце верыць у цуды!



***Ала ЦУПЕР (алімпійская чэмпіёнка):***

— Самыя яркія ўспаміны і асацыяцыі Новага года ў мяне звязаны з тым, што тата заўсёды прыносіў у дом жывую елку, мы яе ўсе разам упрыгожвалі і чакалі навагоднюю ноч, каб атрымаць падарункі. Заўсёды хацелася знайсці там цукеркі і лялькі.

Цяпер, пакуль у нас яшчэ маладая сям'я, асаблівых традыцый няма, але мы заўсёды сустракаем гэтае свята разам.

Усім аматарам спорту ў новым годзе хачу пажадаць галоўнага — моцнага здароўя, поспехаў, удачы і новых перамог.



***Сцяпан ПАПОЎ (чэмпіён свету і Еўрапейскіх гульняў)***

— Для мяне Новы год быў і застаецца сямейным святам, праводзілі яго заўсёды з бацькамі і братам, было весела, у гэтыя дні асабліва хочацца шчасця, падарункаў. Зараз дзеці, вядома, занадта распешчаны колькасцю і разнастайнасцю цацак, а тады для нас любая маленькая рэч была вялікім шчасцем. У ролі Дзеда Мароза выступаў тата, і мы ніколі не былі абдзелены ўвагай навагодняга чараўніка.

Цяпер ужо мае дзеці пішуць лісты Дзеду Марозу і ставяцца да гэтага вельмі сур'ёзна, просяць падарункі не толькі для сябе, а адразу і для таты, і для мамы.

У гэтым годзе плануем сустрэць Новы год у мяне на радзіме, у Лепелі, спадзяюся, будзе шумна і весела.

Аматарам спорту, чытачам «Звязды» жадаю ў надыходзячым годзе больш яркіх падзей, спартсменам — добрых выступленняў і перамог, каб гледачы атрымлівалі асалоду, каб спорт прыносіў не толькі здароўе, але і радасць.



***Аляксандр БАГДАНОВІЧ (алімпійскі чэмпіён, пераможца чэмпіянату свету і Еўрапейскіх гульняў):***

— Новы год — асаблівае свята для ўсіх жыхароў нашай краіны. Заўсёды ў гэтыя святочныя дні чакаеш цудаў, падарункаў, сюрпрызаў, ён заўсёды поўны нейкай таямнічасці, загадкі.

Я прытрымліваюся традыцыі хадзіць у лазню перад Новым годам, а калі ўспомніць самае запамінальнае свята, то гэта будзе момант з дзяцінства. Мама падарыла мне новенькія канькі, я раніцай устаў, залез пад ёлку, пакуль усе спалі, убачыў іх і быў проста шчаслівы. Нават не паглядзеў на надвор'е за акном, надзеў іх і выскачыў на вуліцу.

Зараз я заўсёды стараюся рабіць сюрпрызы для сваіх сяброў, сям'і, люблю дарыць нечаканыя падарункі і здзіўляць.

Усіх чытачоў віншую з надыходзячымі святамі і жадаю ў навагоднюю ноч чакаць цудаў, і тады яны абавязкова здарацца. Хай кожны чалавек, хто не сустрэў каханага, знойдзе сваю другую палавінку. Шчасця ўсім!



***Андрэй МІХНЕВІЧ (чэмпіён свету):***

— Жыццё раней было трошкі іншым, таму з асаблівым размахам Новы год не сустракалі. У дзяцінстве ў Дзеда Мароза ў асноўным прасілі прысмакі, было шчасцем убачыць цукеркі пад ёлкай.

З юных гадоў я прывык сустракаць гэтае надзвычайнае свята з сям'ёй, так і да гэтага часу: мы запрашаем да сябе родных або ездзім да іх самі. Не так важна, што стаіць на навагоднім стале, галоўнае — каб атмасфера і настрой былі добрымі. Аліўе, шампанскае і мандарыны неяк самі выпадкова з'яўляюцца на свяце.

У новым годзе хацелася б пажадаць людзям больш цярпення, каб быў душэўны камфорт, больш радавацца добрым момантам, якія хоць часам, але сустракаюцца на нашым шляху, не ўспамінаць дрэннае, ісці і думаць пра добрае. Чым больш мы будзем радавацца, тым больш радасці будзем адчуваць у сабе.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

*Ну, хто тут не верыў, што прыйдзе зіма,*
*Што рэчкі застынуць і лужы?*
*Ва ўсіх недаверкаў гараць недарма*
*З-пад шапак замерзлыя вушы.*

*Дарэмна сіноптык прагноз выдумляў,*
*Лічыў пацяпленне планеты.*
*Што зробіш, калі Дзед Мароз загуляў*
*Ў кампаніі з бабіным летам.*

*Каляднаю зоркай асвеціцца змрок.*
*Яна — ўсім надзея і ўкраса.*
*І толькі самотны пажоўклы лісток*
*Не здрадзіць мінуламу часу.*




Яўгена ПЯСЕЦКАГА фота слова



■ Ну і ну!

# УСЕ ВАР'ЯЦТВЫ ЗРОБЛЕНЫ ДА НАС?

## Дзіўныя і бессэнсоўныя дасягненні з Кнігі рэкордаў Гінеса

**Сёлета Кнізе рэкордаў Гінеса (дарэчы, самай выдаваемай у свеце кнізе, абароненай аўтарскім правам) споўнілася 60 гадоў. Якіх толькі рэкордаў не давялося фіксаваць і пацвярджаць яе ўкладальнікам за гэты час! Дзесяцігоддзямі не стрыжаныя пазногці і выкананыя на злом галавы трукі, незвычайныя святы з удзелам многіх тысяч людзей і шэдэўры кулінарнага майстэрства, якімі можна было б накарміць цэлыя гарады... Зрэшты, усё гэта мілыя кветачкі ў параўнанні з дзіўнымі ўчынкамі, якія здзяйснялі людзі ў памкненні трапіць у запаветны спіс рэкардсменаў. Прапануем вашай увазе падборку рэкордаў, якія аб'ядноўвае выключная бескарыснасць і ключавое слова «Навошта?!».**

**1.** Ведаеце тоненькія рознакаляровыя гумкі, якімі звычайна мацуюць стосы купюр, квіткі, інструкцыі да бутэлечак з лекамі і ўсялякую канцылярскую драбязу? Яны так і называюцца «канцылярскія гумкі» і вырабляюцца, між іншым, ужо 160 гадоў. Каб гумкі не блыталіся і не губляліся, часта іх скручваюць у шарык і нанізваюць адну на адну. Дык вось, нехта Джоэл Кэрліс нанізаў такім чынам 700 000 (!) гумак і атрымаў гіганцкі шар, дзякуючы якому і трапіў у Кнігу рэкордаў Гінеса. Крута. Мабыць, рэкардсмен доўга назіраў за жукамі-гнаевікамі.

**2.** А вось яшчэ адно надзвычай дзіўнае і, наогул, вельмі неабходнае для жыцця ўменне. Немец Сайман Элмар з'яўляецца ўладальнікам сусветнага рэкорду па колькасці кактэйльных трубачак, якія ён адначасова можа засунуць сабе ў рот за 10 секунд.



Колькасць трубачак круглая і прыгожая — ажно 400, і, дарэчы, цэлых шэсць гадоў ніхто не можа пабіць гэты рэкорд, хоць спробы былі.

**3.** Ці здаралася вам у ружовым дзяцінстве падчас сямейнага абеду замест таго, каб з апетытам паглынаць мамін суп, дзьмуць на лыжку і спрабаваць утрымаць яе ў сябе на носе? Не? Ну, пэўна, таму вы і не рэкардсмен. Аарану Кейсі пашанцавала больш: ён здолеў не толькі ўтрымаць у сябе на твары 17 лыжак, але і стаць непераможным рэкардсменам у гэтым відзе... так скажам, неалімпійскага спорту.

**4.** Адразу папярэджваем: цяжарным, грэблівым і людзям са слабымі нервамі і жывым уяўленнем лепш прапусціць гэты пункт. Бо гаворка ў ім ідзе пра аўстралійскага бібліятэкара, які трапіў у Кнігу рэкордаў з прычыны таго, што на працягу 26 гадоў калекцыянаваў пух, які збіраўся ў яго ў пупку. Больш за тое, праз прафесійную звычку ці характар ён гэты пух яшчэ і карпатліва каталагізаваў — храналагічна і па колеры.

**5.** Не выдыхайце з палёгкай — рана! Фін Кехлер усталяваў не менш уражлівы рэкорд: на працягу дзесяці секунд утрымліваў на ўласным твары 43 слімакі.



Дзеля таго, каб адчуць усю глыбіню гісторыі, трэба ўлічваць, што Кехлер не проста бяскрыўдны вар'ят-адзіночка: ён мэтанакіравана трэніраваўся, каб пабіць папярэдні рэкорд, роўны 36 слімакам. А значыць, зацікаўленых у «слімаканосьбіцтве» людзей ужо больш за аднаго...

**6.** Наступны рэкардсмен па імені Ван Дзік нічога агіднага не рабіў — проста ўзяў ды нацягнуў на сябе 227 футболак. Не пытайцеся як — мы і самі не ведаем. Ці варта згадваць аб тым, што містар Дзік зноў жа не выступіў першаадкрывальнікам у гэтай справе, а толькі пабіў папярэдні рэкорд, які некалі таксама пабіў папярэдні рэкорд. Людзі штогод спрабуюць надзець на сябе яшчэ больш футболак — прывітанне стваральнікам фільма «Паслязаўтра».

**7.** Англія славіцца не толькі выключнымі даследаваннямі сваіх вучоных, але і дзіўнымі рэкордамі. Так, менавіта ў гэтай краіне была зафіксавана самая вялікая колькасць людзей, якія прайшлі па плошчы ў касцюмах пінгвінаў. Дарэчы, не так іх было і шмат, як вы сабе, напэўна, уявілі, — усяго 373



■ Да ведама

## ЁЛКУ — ЛЕГАЛЬНА

**Дзяржаўная лясная ахова пераходзіць на ўзмоцнены рэжым аховы ўгоддзяў для недапушчэння незаконных высечак хвойных дрэў.**

У лясах краіны выстаўлены пасты і на рэгулярнай аснове праводзяцца рэйды па выяўленні парушальнікаў. Для большай эфектыўнасці ў апошніх задзейнічаны прадстаўнікі Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету і супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. У прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі паведамілі, што на аўтадарогах выстаўлена больш за 300 кантрольных пастоў. Асаблівая ўвага будзе надавацца ўчасткам лесу паблізу вёсак. Працягнуцца рэйдавыя мерапрыемствы ўсе навагоднія святы.

Штрафы парушальнікаў чакаюць немалыя: ад 900 тысяч да 9 мільёнаў. Індывідуальнаму прадпрымальніку давядзецца выкласці ад 3,6 мільёна да 36 мільёнаў, юрыдычнай асобе — ад 9 мільёнаў да 54 мільёнаў. Таму лепш не псаваць сабе свята і набыць навагодняе дрэўца на законных падставах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 30 СНЕЖНЯ

**1530** год — 485 гадоў з часу нараджэння Андрэя Волана, палітычнага дзеяча, філосафа і прававеда, аднаго з заснавальнікаў свецкага напрамку ў сацыяльна-палітычнай думцы, ідэолага рэфарматарскага руху ў Беларусі і Літве, спаўняецца ў гэтым годзе. Адукацыю атрымаў ва ўніверсітэтах Франкфурта-на-Одэры і Кёнігсберга. Абіраўся паслом ад шляхты Ашмянскага павета ў сейм Рэчы Паспалітай. Быў сакратаром у вялікага князя літоўскага і караля Польшчы Жыгімонта II Аўгуста. Унёс значны ўклад у развіццё грамадскай, палітычнай і прававой думкі ў Беларусі. Выступаў за рэформы ў сацыяльных і палітычных адносінах, праве і дзяржаўным кіраўніцтве, распрацоўваў канцэпцыі свабоды чалавека. У творчасці Волана развіты некаторыя ідэі, выказаныя ў свой час Ф. Скарынам. Аўтар каля 30 работ (палеміка-тэалагічныя творы, палітыка-прававыя і этычныя трактаты, прамовы). Памёр у 1610 годзе.



**1865** год — 150 гадоў таму нарадзіўся Джозэф Рэдзьярд Кіплінг, англійскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1907). Аўтар раманаў «Святло пагасла», «Кім», зборнікаў «Песні казармы», «Сем мораў», «Кнігі джунгляў» і іншых.

**1918** год — VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП (б), што адкрылася ў Смаленску, спецыяльнай рэзалюцыяй пастанавіла абвясціць Заходнюю камуну Беларускай Савецкай Рэспублікай. На канферэнцыі была створана Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі (КП(б) Б). Канферэнцыя абвясціла сябе I з'ездам КП(б) Б. Старшынёй ЦК партыі быў абраны А.Ф. Мясвікоў.

Было сказана

**Алег ЛОЙКА, літаратуразнавец, паэт:**
*«Дзяды — вытокі кожнага народа».*

Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

КОШКА (КОТ) — хатняя жывёла, да якой у народзе заўсёды ставіліся неадназначна. З аднаго боку, кату дазвалялася жыць у хаце ў непасрэднай блізкасці з чалавекам, з другога боку, яго лічылі прадстаўніком свету нячыстай сілы. Ката паважалі за яго бязмежную грацыёзнасць літаральна ва ўсім: руху, пасадцы, пры ўмыванні ці на паляванні, што таксама было знешняй праявай глыбокага ўнутранага спакою і самадастатковасці. Сярод іншых хатніх жывёл кошка вылучалася чысцінёй.

Нашы продкі разводзілі катоў у першую чаргу, каб ахоўваць зернесховішчы ад пацукоў і іншых мелкіх грызуноў. У народным паданні аб Ноевым каўчэгу Ной заткнуў шчыліну, якую прагрыз пацук — д'ябальскае стварэнне, хусткай, а Бог ператварыў хустку ў кошку, каб яна лавіла пацукоў.

◈ У народным асяродку цанілі характар гэтай жывёлы і адводзілі ёй ролю хатняй, блізкай да чалавека істоты. Нашы продкі лічылі, што мурканне кошкі — гэта своеасаблівая малітва за выратаванне гаспадара, які ў гэты момант быў па-за межамі хаты.

◈ Разам з тым існаваў і такі вобраз кошкі, які сімвалізаваў ляноту і сласталюбства. Часам жанчыну параўноўвалі з кошкай і надзялялі яе такімі якасцямі, як пошасць, схільнасць да варажбы і магіі. Незалежны нораў кошкі, начныя вандроўкі, агеньчык у вачах, які можна заўважыць нават у цемры, — усё гэта выклікала хутчэй жах, уздзейнічала пагражаючы. Кашачыя вочы называлі «вакенцамі ў іншы свет». Кошкі заўсёды звязваліся са звышнатуральным з тых часоў, як іх прыручылі.

◈ Асаблівая сімвалічная роля прыпісвалася чорным і трохкаляровым кошкам. Лічылася, што трохкаляровыя кошкі ахоўваюць хату ад пажараў. Той, хто забіваў такую кошку, на працягу сямі гадоў павінен быў чакаць пакарання за здзейсненае. Па меркаваннях старых людзей трохкаляровая, а асабліва сямікаляровая кошка, прынясе ў хату шчасце, а чорная кошка абароніць ад рабаўнікоў.

Сярод славян здавён жыве вера ў тое, што чорная кошка, якая перайшла дарогу, нясе непрыемнасці, няўдачу і няма сэнсу працягваць надалей свой шлях, лепей вярнуцца дадому. Цікава, але ў Англіі, наадварот, лічаць, што няшчасце нясуць белыя кошкі, а чорныя — поспех.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.29 | 16.55 | 7.26 |
| Віцебск | — 9.26 | 16.38 | 7.12 |
| Магілёў | — 9.19 | 16.45 | 7.26 |
| Гомель | — 9.07 | 16.51 | 7.44 |
| Гродна | — 9.42 | 17.12 | 7.30 |
| Брэст | — 9.34 | 17.22 | 7.48 |

### Месяц

***Поўня 25 снежня.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

### Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Антона, Данілы, Івана, Мікалая, Пятра, Сцяпана.*
***К.** Кацярыны, Яўгеніі, Яўгена.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Вова, ты ведаеш, што трэба рабіць, калі ты ідзеш з дзяўчынай з дыскатэкі, а да яе пачалі прыставаць хуліганы?
— І што?
— Уцякаць, сыночак, уцякаць! І памятай: прыгожых дзяўчат шмат, а ты ў мамы адзін!

**Сяджу на дыеце, скінула 2 кг, галава перастала цяміць. Мабыць, гэта быў мозг!**

— Дарагая, я вырашыў, што больш ніколі не буду з табой лаяцца!
— Не, ну вы толькі паглядзіце на яго, ён вырашыў! А ў мяне ты спытаўся?!

**Зараз яшчэ крыху пацяплее — і Новы год будзем сустракаць... на прыродзе з шашлыкамі!**




Малюнак Аляксандра БУЛАЯ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zviazda.by, (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 5103.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 29 снежня 2015 года.